ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# Дзедзіч

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 4 (35)
ЧЭРВЕНЬ 2005

2 ШТРАФ ЗА НАПАМІН ПРА ЧАРНОБЫЛЬ
Казаць праўду ў Беларусі забаронена

4 ЖЫХАРОЎ «ДЗЯРЖЫНКІ» ХВАЛЮЕ ПРАБЛЕМА ДУША

6 РАМАН ХЦЕЙ
У рубрыцы «Маладыя галасы»

8 СВЕТ У ЗЯЛЁНЫМ КОЛЕРЫ
Інтэрв'ю наркамана са стажам

# ПОЗИТИВ В СТИЛЕ СЛАЙД-РОК

**ПЕРВЫЕ ПОПЫТКИ СОЗДАНИЯ ГРУППЫ, КОТОРАЯ ТЕПЕРЬ НОСИТ НАЗВАНИЕ "СЛАЙДЫ", БЫЛИ СДЕЛАНЫ В 2002г., А УЖЕ В 2003-М РЕБЯТА ЗАНЯЛИ ПОЧЁТНОЕ ВТОРОЕ МЕСТО НА ФЕСТИВАЛЕ БРЕСТСКИХ РОК-ГРУПП "ЗОЛОТАЯ ОСЕНЬ".**



Успех вдохновил музыкантов, и итогом упорной работы стала победа "Слайдов" на "Золотой осени-2004". В феврале 2005г. вышел их дебютный альбом "Позитивы". Мы решили выяснить, в чём причина столь стремительного прорыва, лично пообщавшись с ребятами после одного из их выступлений. На волне хорошего настроения музыканты с большим удовольствием отвечали на вопросы, много шутили и смеялись, – одним словом, излучали позитив. Итак, знакомьтесь: Влад Филиппов (вокал, гитара), Вова Майшук (гитара), Саша Знахарчук (бас), Виктор Локтиков (клавиши), Андрей (Бобёр) Абрамов (барабаны).

**– Расскажите о вашем первом альбоме.**

Влад: Альбом полностью позитивный. И название соответствующее. Это было концепцией альбома – собрать позитивные песни. Во втором альбоме будет совершенно иная концепция.

Вова: Возможно, он будет называться "Негативы" (смеется).

**– Влад, обращаюсь к тебе, как автору текстов. О чём твои песни?**

Влад: Об отношениях человеческих. Таких, какие они есть. Петь о том, как мне плохо, мне не хочется. И так всем сейчас не очень хорошо. А если ещё петь о том, как мне плохо… Минус на минус не даёт плюс в данном случае.

**- Стиль, в котором играет группа "Слайды"?**

Влад: Слайд-рок.

**– Что вы вкладываете в это понятие?**

Андрей: Это стремление к минимализму. Как можно меньше нот, как можно медленнее ритм и как можно больше музыкальности.

**– В музыкальной среде много говорят о вашем сотрудничестве с группой ONEGIN. На чём оно всё-таки базируется?**

Саша: Не столько сотрудничество, сколько дружба. То есть сотрудничество основывается на дружбе, прежде всего.

**– ONEGIN играет тяжёлую музыку. У вас не возникало желания попробовать сделать что-нибудь в подобном стиле?**

Андрей: Есть. Искореняем (дружный смех).

Влад: Сейчас все играют тяжесть, это модно. Мы предпочитаем оставаться в оппозиции.

Вова: Опять же – стремление к минимализму.

**– Есть ли какие-нибудь западные коллективы, на которые ориентируется в своём творчестве группа "Слайды"?**

Вова: Если раньше и были какие-то конкретные ориентиры, то сейчас стремимся к независимости. К тому же нас в группе пятеро – и у каждого в музыке какие-то свои пристрастия, поэтому каждый вносит частичку чего-то своего. Но порой бывает очень сложно убедить всех играть. Приходится подстраиваться друг под друга и работать как один слаженный механизм.

**– Только появившись на брестской рок-сцене, вы в 2004г. стали обладателями гран-при «Золотой осени». В чём, по-вашему, причина успеха?**

Влад: Людям нужна лёгкая музыка. Все устали от "мяса", причём не всегда качественного.

Вова: Успех в гармонии, в мелодике, а не в каком-то "мясе".

**– Вы часто даёте концерты?**

Влад: За прошлый год мы вошли в тройку брестских коллективов по количеству концертов. В общей сложности получилось около пятнадцати. А рваться куда-то за рамки Бреста, я считаю, не стоит, так как необходимо сначала наработать себе публику в родном городе.

**– Есть ли концерт, который запомнился больше всего?**

Вова: Самым запоминающимся был первый концерт. Скорее это был даже не концерт – прослушивание на "Золотую осень-2003". Было очень много адреналина и энергетики.

**– Вы ребята молодые и наверняка амбициозные. Какое будущее у группы "Слайды"?**

Влад: Не нужно думать о будущем. Нужно делать что-то, и всё сложится.

Вова: Будущее очень непредсказуемо. Всегда, когда пытаешься планировать, всё на самом деле выходит по-другому.

**– А что в ближайших планах?**

Вова: Работать дальше, записывать новые песни. У нас уже есть материал для второго альбома.

**– Чем занимаетесь помимо музыки?**

Влад: Работаем. На музыку же надо как-то зарабатывать (смеется). А вообще, конечно, совмещаем занятия музыкой с учёбой, работой.

**– На личную жизнь время остаётся?**

Саша: Музыка – это и есть личная жизнь.

Влад: У меня с этим проблемы – поэтому некоторые считают меня тронутым товарищем.

**– Что же тогда вдохновляет на создание песен?**

Влад: Многое вдохновляет. Иногда можно ехать в троллейбусе – и это вдохновит на создание кусочка текста, который потом войдёт в песню.

**– А если взять более глобально?**

Влад: Ну если рога у троллейбуса слетят с проводов – вот это более глобально.

**– Песни про любовь у вас есть?**

Влад: Да все песни про любовь…

**– Большинство ваших поклонников – девушки, и многие наверняка не прочь познакомиться с вами поближе. Идеал девушки для вас?**

Влад: Девушка должна просто не бояться подойти познакомиться.

Саша: Идеальная девушка – эта та девушка, о которой не думаешь, какой она должна быть. Тебе хорошо только оттого, что она есть рядом.

**– Пожелания поклонницам?**

Влад: Любите Бобра! А то он там за барабанами сидит сзади сцены вечно обделённый женским вниманием.

Саша: Приходите на концерты, слушайте хорошую музыку, а Бобра, собственно, можно и не любить.

Вова: Будьте самими собой.

**Вера ЕРЕМОВА**

**P.S.** Поближе познакомиться со "Слайдами" можно на официальном сайте группы www.slidesrock.com, а оценить их творчество вы сможете, купив диск "Позитивы" в торговых рядах "Кирмаш". В аудиоархиве "Дзедзіча" также есть альбом "Позитивы", так что приходите, послушаем вместе.

## АДНЫМ РАДКОМ

### «ГУКІ» ПРАЦЯГВАЮЦЦА

БАМГА "Сузор'е" працягвае акцыю "ГУКі". Акцыя накіравана на папулярызацыю беларускамоўнай музыкі сярод берасцейскай моладзі. Яе сэнс у тым, што любы малады чалавек можа абсалютна бясплатна памяняць свае непатрэбныя аудыёкасеты на "б/у" касеты з запісамі беларускіх музыкаў. Прычым можна на свой уласны музычны густ выбраць любога беларускага выканаўцу: ад бардаў Шалкевіча ці Бартосіка да папулярных "Нейра-дзюбеля" ці "Крамы".



Акцыя доўжыцца ўжо месяц, і за гэты час абмяняць свае старыя касеты вырашылі 43 маладыя берасцейцы. Агульная колькасць памененых касет склала 126 адзінак. Першыя вынікі "ГУКаў" каментуе адзін з ініцыятараў акцыі Сяржук Ратнікаў:

– У першыя дні пасля абвяшчэння акцыі наш тэлефон проста разрываўся. Мы не былі падрыхтаваныя да такога ажыятажу. Нярэдка не хапала касет з самымі папулярнымі выканаўцамі, часам мы проста фізічна не паспявалі рабіць новыя запісы. Найбольш папулярныя ў берасцейцаў "NRM" (23 касеты) і "Крама" (13 касет). Карысталіся попытам таксама запісы "Крамбамбулі", "Ляпісаў" і Віктара Шалкевіча. Некаторыя сціпла прынасілі адну-дзве касеты, а аднойчы прыйшоў кіроўца "Хуткай дапамогі" і "намяняў" ажно 17 касет – гэта на сёння абсалютны рэкорд.

Не абыйшлося і без кур'ёзаў. Так, дзякуючы аднаой берасцейскай газеце, якая ў агучаны намі спіс уключыла чамусьці гурт "Леприконсы", ды яшчэ й пазначыла, што на абмен выдаюцца новыя касеты, мы атрымалі шалёную колькасць тэлефанаванняў ад прыхільнікаў "Леприконсов", "Красок" і падобнай музыкі. Трэба яшчэ раз адзначыць, што ў нас можна знайсці ТОЛЬКІ беларускамоўную музыку! І не на новых касетах, а на такіх самых ужываных, якія нам прыносяць на абмен. У тым-та і сэнс акцыі – без асаблівых выдаткаў папулярызаваць беларускамоўную музыку.

Арганізатары акцыі запэўніваюць, што любы малады чалавек знойдзе музыку на свой густ: аудыёархіў "Сузор'я" налічвае больш за 500 гадзін беларускамоўнай музыкі, альбо 35Гб у электронным фармаце.

Адзіная ўмова – касеты, якія вы прыносіце на абмен, павінны быць у рабочым стане (здатныя да перазапісу) – каб акцыя працягвалася далей.

Застаецца дадаць, што акцыя будзе доўжыцца да 1 жніўня. Задаць пытанні арганізатарам акцыі можна па тэл.: 23-68-02, (029) 77-949-77.

**Dzedzich week-news**

**Шаноўныя сябры!**

**Рэдакцыя "Дзедзіча" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, якія пабачыць свет у сярэдзіне верасня 2005г.**

**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 23-68-02 да 20.08.05.**

# ШТРАФ ЗА НАПАМІН

## ПРА ЧАРНОБЫЛЬСКУЮ ТРАГЕДЫЮ

**20-ГАДОВАЯ АКСАНА ЦІМЧАНКА ПАКАРАНАЯ ШТРАФАМ ПАМЕРАМ 30 ТЫСЯЧАЎ РУБЛЁЎ. ДЗЯЎЧЫНУ АБВІНАВАЦІЛІ Ў РАСПАЎСЮДЗЕ НЕЗАРЭГІСТРАВАНАЙ ДРУКАВАНАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў ГАДАВІНУ АВАРЫІ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС.**

Адміністрацыйная камісія Ленінскага раёну Берасця разглядала справу студэнткі Аксаны Цімчанкі на падставе складзенага на яе 26 красавіка пратаколу. У гэты дзень у Берасці адбывалася акцыя "Свечка памяці", прысвечаная гадавіне аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Міліцыянты тады затрымалі спадарыню Цімчанку нібыта за распаўсюд улётак, якія былі зробленыя з парушэннем закону. У прыватнасці, міліцыянты цвердзілі, што паколькі ўлёткі надрукаваныя ў Смаленску, яны не могуць распаўсюджвацца ў Беларусі.

Аксану абвінавацілі ў парушэнні ч. 3 арт. 172 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях: "Распространение печатных изданий, изготовленных с нарушением установленного порядка и не имеющих выпускных данных, содержание которых направлено на причинение ущерба государственному и общественному порядку, правам и законным интересам граждан". За парушэнне гэтага артыкулу можна вынесці папярэджанне альбо штраф ад 1 да 5 базавых адзінак (1 базавая адзінка – 25500р). Адміністрацыйная камісія наклала штраф – 30000р.

Гэтую падзею каментуе Дзмітрый Шыманскі – кіраўнік БАМГА "Сузор'е", валанцёрам якога з'яўляецца Аксана Цімчанка:

– Сваім рашэннем улады паказалі, што ў Беларусі напамін пра чарнобыльскую трагедыю "причиняет ущерб государственному и общественному порядку". А гэта значыць, што на ўлётках, якія мы распаўсюджвалі падчас акцыі "Свечка памяці" напісаная праўда: сённяшняя ўлада замоўчвае інфармацыю пра сапраўдныя наступствы аварыі на ЧаАЭС. І Аксану пакаралі не за тое, што яна парушала грамадскі парадак, а за тое, што спрабавала выказаць праўду пра Чарнобыль. А казаць праўду ў нашай краіне, як высветлілася, забаронена. Адпраўляць прымусова выпускнікоў па размеркаванні ў забруджаныя радыяцыяй раёны – не забаронена, вырошчваць на забруджаных землях сельскагаспадарчую прадукцыю, якую мы пасля спажываем – не забаронена, а нагадваць берасцейцам пра вынікі аварыі – гэта парушэнне закону. Безумоўна, мы дапамаглі Аксане выплаціць штраф.

**Dzedzich week-news**

# КАК ВСТУПИТЬ В БРСМ?

**С АНАЛОГОМ СОВЕТСКОГО КОМСОМОЛА – БРСМ, ЗНАКОМЫ ВСЕ. ПОД ЛОЗУНГОМ "С НАМИ ЛУЧШИЕ ИЗ ЛУЧШИХ" В ЭТУ ОРГАНИЗАЦИЮ ПРИНИМАЮТ ВСЕХ И КАЖДОГО НЕ ТОЛЬКО ПО ЖЕЛАНИЮ, НО И ПРИНУДИТЕЛЬНО.**

Чем же БРСМ так привлекает молодых людей? Конечно, развитая система скидок на дискотеках, в парикмахерских салонах, кинотеатрах и в других местах ещё никому не мешала. Получается, что патриотизм молодёжи вырабатывается путём дрессировки: "Стань на задние лапки – получишь конфетку".

В школах стремительным шагом идёт зачисление в БРСМ. Особого желания сразу все не проявляют, зато оно рождается, как только ученики сталкиваются с поступлением. В Военную академию, Школу милиции, Академию МВД и ряд других учебных заведений придти поступать без билета БРСМ то же самое, что явиться без паспорта. Лучше и вправду не рисковать, без него же и в стройотряд не возьмут и ещё куда-нибудь. А возникающие проблемы с поселением в общежитие при отказе вступать в БРСМ у иногородних студентов уже далеко не единичные случаи.

Нельзя обойти вниманием и праздничные концерты, которые устраивает БРСМ. Выступают там те же школьники и студенты, которые за это ничего не получают, зато зрители дружно отдают деньги на билеты. Куда они идут? ... Правильно.

Но о каком же творческом и самостоятельном развитии молодёжи может тогда идти речь? Ведь нет выбора – нет конкуренции, значит, нет движения вперёд и совершенствования. Каждый человек будет делать что-то тогда, когда будет знать, что он соревнуется и хочет быть лучшим.

Путём показухи, с которой мы сталкиваемся, каких-то результатов добиться невозможно. Любой митинг БРСМ – минутное дело. Сними с занятий школьников и студентов, раздай флажки в руки, майки. Созови СМИ – и процесс прошёл. Как всегда, никакой критики, громкие аплодисменты, слова благодарности. "Хвала и слава БРСМ!".

К счастью, насколько формально функционеры БРСМ подходят к повышению численности своих рядов, настолько равнодушно современная молодёжь относится к идеологическим постулатам, проповедуемым этой организацией. Никто из БРСМ-овцев не отважится заявить о всеобщей и бесспорной поддержке государственной идеологии членами этой организации.

**Анастасия МЕЛЕШКО**

## ЦЫТАТА МЕСЯЦА

***Усе мы наважаныя абараняць свабоду ў Беларусі. Людзі гэтай краіны жывуць пад апошняй дыктатурай Еўропы, і яны заслугоўваюць лепшага.***

**Джордж Буш, прэзідэнт ЗША**

**(з прамовы ў будынку Малой гільдыі ў Старой Рызе, Латвія)**



# ХОЧАМ ВЕДАЦЬ ПРАЎДУ

## 7 ТРАЎНЯ 1999г. ЗНІК ЮРЫЙ ЗАХАРАНКА

**АКЦЫЯ "ЛАНЦУГ НЕАБЫЯКАВЫХ ЛЮДЗЕЙ" ПРАЙШЛА 7 ТРАЎНЯ Ў БЕРАСЦІ КАЛЯ ГАНДЛЁВАГА ЦЭНТРА "ЮБІЛЕЙНЫ".**

Акцыя была прымеркавана да сумнай даты: 7 траўня шэсць гадоў таму ў Менску бясследна знік адзін з лідэраў апазіцыі, былы міністр унутраных спраў Беларусі Юрый Захаранка. Да гэтага часу лёс яго невядомы.

7 ТРАЎНЯ 1999 ГОДА ЮРЫЙ МІКАЛАЕВІЧ ЗАХАРАНКА ЗНІК...

Каля 10 чалавек, актывісты палітычных партый АГП, ПКБ, БНФ паўсталі жывым ланцугом уздоўж вуліцы Маскоўскай у раёне "Юбілейнага", трымаючы ў руках партрэты Юрыя Захаранкі.

Сяржук Лазенка, сябра Партыі БНФ, патлумачыў, чаму ён удзельнічае ў акцыі:

– Прайшло 6 гадоў, як знік Юрый Захаранка і іншыя відныя дзеячы апазіцыі, але мы па-ранейшаму хочам ведаць праўду, ведаць, што з імі здарылася і хто ў гэтым вінаваты!

Акцыя працягвалася каля гадзіны і скончылася тыпова для сённяшніх беларускіх рэаліяў: намеснік кіраўніка Маскоўскага РАУС сп. Базылевіч загадаў удзельнікам акцыі разысціся, папярэдзіўшы, што праз 10 хвілін усе яны будуць затрыманыя.



**Падчас акцыі «Ланцуг неабыякавых людзей». Берасце, 7 траўня 2005г.**

На пасту міністра Ю.Захаранка працаваў крыху больш за год. Пазней ён успамінаў: «Наверное, я остался одним из немногих, кто говорил Лукашенко правду. Ту правду, нехорошую правду, которая била по самолюбию президента, но я говорил ее... Когда мы разговаривали с президентом, он сказал мне: «Ты должен выполнить любой мой приказ». Я ему говорю: «Александр Григорьевич, людей расстреливать не буду, Конституцию нарушать не буду». А он тогда: «Если ты не выполнишь любой мой приказ, на тебя наденут наручники». Это стиль руководства президента».

Экс-міністр Юрый Захаранка стаў адным з актыўных дзеячоў апазіцыі: удзельнічаў у супрацьстаянні паміж Лукашэнкам і Вярхоўным Саветам напярэдадні рэферэндуму 1996г., арганізаваў Кангрэс у абарону дэмакратыі. Захаранка становіўся небяспечным для рэжыму чалавекам. І ў кагосьці вельмі важнага ў кіраўніцтве дзяржавы не вытрымалі нервы.

Праз 10 хвілін міліцыя затрымала старшыню Берасцейскай абласной арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі Сцяпана Навасельчана разам з сынам. Іх даставілі ў Маскоўскі РАУС, дзе склалі пратакол за арганізацыю несанкцыянаванай масавай акцыі.

Па словах аднаго з удзельнікаў "Ланцуга" сп. Мікалая Каўша, берасцейцы з цікаўнасцю паставіліся да акцыі, задавалі пытанні, выказвалі падтрымку.

Вакол удзельнікаў акцыі ўтварыўся цэлы натоўп мінакоў і гандляроў з рынку, якія патрабавалі ад міліцыянтаў тлумачэння прычынаў затрымання людзей, якія нічога дрэннага не зрабілі. Патрабавалі марна: кіраўніцтва РАУС з'ехала, не даўшы ніякіх тлумачэнняў сваім дзеянням.

**Dzedzich week-news**

## ВІТАЮ ВАС, ШАНОЎНЫЯ "ДЗЕДЗІЧЫ".

### ПОШТА ДЗЕДЗІЧА

*У рассылцы Dzedzich week-news вы пісалі пра акцыю ў чарговую гадавіну знікнення Юрыя Захаранкі.*

*Добрая справа (вядома, не міліцыянтаў :). Нарэшце мясцовыя палітлідары зразумелі, што не трэба агітаваць улады і пенсіянераў у цэнтры горада, а трэба ісці бліжэй да простых людзей.*

*Падобныя акцыі варта рабіць найперш у мікрараёнах, у людных месцах. І не трэба стаяць доўга, пакуль не затрымаюць.*

*Варта зладзіць пікет на 30-40 хвілінаў (а практыка пакажа, можа й менш – 15-20) і пераязджаць у іншы, суседні мікраараён горада. Паінфармуеце тады большую колькасць людзей за гэты ж час.*

*Тым больш, пікеты звычайна нешматлікія (да 10 чалавек) і ўсім разам не цяжка сабрацца і пераехаць на аўто ці гарадскім транспарце ў іншыя месцы. Вулька, Валынка, Бярозаўка, Рэчыца, тэхналагічны універсітэт, Граеўка, Кіеўка і іншыя мікрараёны мусяць ведаць вас і тады будуць і далучацца да падобных акцыяў!*

*І яшчэ. Не трэба гаварыць, што гэта была акцыя апазіцыі! Гэта прынцыпова важна! Ніякая гэта не апазіцыя, гэта пазіцыя! Гэта была акцыя НАРМАЛЬНЫХ неабыякавых людзей!*

*Заўсёды гэта падкрэслівайце!*

*Поспехаў!*

*Жыве Беларусь!*

***Ігар БАРАНОЎСКІ***

### АДНЫМ РАДКОМ

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА БУДЗЕ ЖЫЦЬ!

14 траўня, у 10-ю гадавіну рэферэндуму, на якім расейская мова атрымала статус дзяржаўнай у РБ, сябры БАМГА "Сузор'е" правялі на вуліцах Берасця апытанне моладзі, каб высветліць іх стаўленне да перспектыў развіцця, а, хутчэй, выжывання беларускай мовы.

Было апытана 200 маладых хлапцоў і дзяўчат ва ўзросце ад 16 да 25 гадоў.



16% з іх увогуле не ведаюць беларускую мову. Затое 63% прызналіся, што час ад часу чытаюць беларускамоўныя кніжкі. Найбольш папулярнымі аўтарамі ў маладых берасцейцаў з'яўляюцца Я.Купала, В.Быкаў, М.Багдановіч, У.Караткевіч – гэтыя прозвішчы, вядомыя кожнаму беларусу са школьнай праграмы, берасцейцы называлі часцей за іншыя. З беларускамоўнай музыкай сваё знаёмства засведчылі 67% апытаных, прычым гурты "NRM", "Крамбамбуля" і "Крыві" называліся нават часцей, чым "старажылы" беларускай эстрады "Песняры" ці Алеся.

У 55% маладых людзей ёсць знаёмыя, якія размаўляюць на беларускай мове, 37% размаўляюць па-беларуску самі, а вось 40% здзіўляюцца, калі чуюць ад мінакоў на вуліцах беларускую гутарку. Затое 61% берасцейскай моладзі выказаўся супраць палітыкі, скіраванай на развіццё рускай мовы ў нашай краіне, а 42% вераць, што беларуская мова раней ці пазней стане для нас такой жа звычайнай, як польская для палякаў ці французская для французаў. Праўда, варта адзначыць, што за тое, каб у Беларусі была адна дзяржаўная мова – беларуская, – выказалася толькі 38% апытаных.

Падводзячы вынікі, адзначым, што для берасцейскай моладзі пытанне пра выжыванне беларускай мовы не стаіць. Апытанне засведчыла, што значная частка моладзі ведае і карыстаецца беларускай мовай, а значыць яна будзе жыць.

**Dzedzich week-news**

## ЧАРГОВАЕ "БАСОВІШЧА" АДБУДЗЕЦЦА 22-23 ЛІПЕНЯ

У польскім мястэчку Гарадок пад Беластокам 22-23 ліпеня адбудзецца XVI фестываль беларускага року "Басовішча-2005".

Традыцыйна бяруць удзел генералы айчыннай музыкі: NRM, Krama, Neuro Dubel, Zet, Ulis, а таксама леташнія пераможцы "Тарпач", "Сонцаварот", "Таксі", НМР і іншыя каманды. Як і ў мінулым годзе, усім, хто пажадае самастойна ўзяць удзел у фэсце, будзе прадастаўлена "Вольная сцэна". Галоўная ўмова — беларускамоўныя тэксты. З беларускага боку на конкурс паедзе 8 выканаўцаў. Для ўсіх жадаючых наведаць адзінае штогадовае свята беларускай рок-музыкі арганізуюцца традыцыйныя аўтобусы.

**Dzedzich week-news**

## АДНЫМ РАДКОМ

### "ПАДПІШЫ СЯБРОЎ!"

«Дзедзіч» працягвае акцыю па падпісцы берасцейскай моладзі на электронную рассылку Dzedzich week-news.

– Быць у курсе ўсіх падзей, што адбываюцца ў моладзевым асяроддзі Берасцейшчыны,

– атрымаць магчымасць паўдзельнічаць у цікавых адукацыйных праграмах, моладзевых абменах з еўрапейскімі краінамі,

– далучыцца да дзейнасці незалежных моладзевых арганізацый,

– трымаць руку на пульсе падзей падчас прэзідэнцкіх выбараў 2006г.,

– стаць удзельнікам "памаранчавай рэвалюцыі па-беларуску" – такія магчымасці дае падпіска на рассылку Dzedzich week-news.

Той, хто падпіша на рассылку 3 сяброў, атрымае фірмовы каляндарык "Дзедзіча", хто падпіша 5 сяброў – ручку з фірмовым лагатыпам, а калі пастарацца і падпісаць 10 чалавек – прызам будзе CD з любой беларускай музыкай альбо відэафільмам на выбар.

За месяц, які доўжыцца акцыя "Падпішы сяброў!" колькасць атрымальнікаў рассылкі павялічылася на 455 чалавек. Сёння рассылку "Дзедзіча" атрымлівае 942 маладыя чалавекі, якія жывуць на тэрыторыі Берасцейскай вобласці.

Варта адзначыць, што нашы падпісчыкі прынялі актыўны ўдзел у акцыі: 10 каляндарыкаў, 34 ручкі і 3 CD з беларускай музыкай былі ўручаныя ў якасці прызоў. Акцыя "Падпішы сяброў!" не мае часовых абмежаванняў. Мы проста час ад часу будзем нагадваць нашым падпісчыкам аб ёй.

Не забывайцеся, што доступ да інфармацыі – адна з найвялікшых каштоўнасцяў XXI стагоддзя. Не пазбаўляйце сваіх сяброў магчымасці атрымаць аб'ектыўную, актуальную і карысную інфармацыю! Падпішыце іх на рассылку Dzedzich week-news!

Падпісаць сяброў можна самастойна на сайце www.dzedzich.org, альбо даслаць іх e-mail на адрас dzedzich@dzedzich.org. Калі вы падпісваеце сябра самастойна, не забудзьце даслаць ліст з пазначэннем падпісаных вамі адрасоў і вашага кантактнага тэлефона.

**Dzedzich week-news**

### БЕСПЛАТНО, НО ОЧЕНЬ ДОРОГО

Изменения в учредительные документы, обусловленные переименованием улиц в Минске, должны быть, по утверждению властей, внесены бесплатно. Однако предпринимателям все же придется выложить кругленькую сумму.

Платить за внесение изменений в учредительные документы, связанных с переименованием улиц, действительно не придется. Размер этой платы, впрочем, не так уж и велик: она составляет 15 EUR. Но, помимо этого, субъект хозяйствования будет вынужден заплатить за нотариальное удостоверение учредительных документов, а это уже выльется в намного большие суммы.

Например, за нотариальное удостоверение изменений в учредительный договор ООО или ОДО в бюджет придется внести 8 базовых величин (25.500 BR). Каждая подпись на уставе юридического лица – 4 базовые величины. Учитывая, что в ООО или ОДО минимум двое участников, выложить придется не менее 8 базовых величин.

Потребуется изготовить копии указанных документов для исполкома, банка и налоговой. Итого в самом благоприятном случае предпринимателям придется заплатить в бюджет примерно 20 базовых величин, или, в более привычных единицах — более 200 USD.

**«Белорусский рынок»**

## КАЗКІ ЖЫЦЦЯ

# ПРАБЛЕМЫ НАРАСТАЮЦЬ, ІХ ВЫРАШЭННЕ – АДКЛАДВАЕЦЦА

**У САКАВІКУ 2005г. ПРАФКАМ ГЕАГРАФІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БРДУ ПРАВЁЎ АНКЕТАВАННЕ НА ТЭМУ "ПРАБЛЕМЫ ПРАЖЫВАННЯ СТУДЭНТАЎ ГЕАФАКА Ў ІНТЭРНАЦЕ №2", ЯКОЕ ДАЛО ДАВОЛІ ЦІКАВЫЯ ВЫНІКІ.**

Студэнтам прапаноўвалася адказаць на розныя па змесце пытанні анкеты. Апытанне адбывалася ў пісьмовай форме і, што вельмі важна – ананімна. А вось якія вынікі адлюстравала апытанне 94-х будучых географаў:

| Пытанне | Так | Не | Не зусім | Устрымаліся |
|---|---|---|---|---|
| 1. Ці задаволены Вы жыццём у інтэрнаце? | 19 | 47 | 28 | 0 |
| 2. Ці задавальняюць Вас правілы пражывання ў інтэрнаце? | 14 | 57 | 19 | 2 |
| 3. Ці садзейнічае адміністрацыя інтэрната паляпшэнню ўмоваў пражывання? | 30 | 32 | 32 | 1 |
| 4. Ці згодны Вы, што наступныя бытавыя праблемы з'яўляюцца найбольш актуальнымі: | | | | |
| а) адсутнасць гарачай вады ва ўмывальніках | 91 | 3 | 0 | 0 |
| б) старая мэбля | 88 | 5 | 0 | 1 |
| в) сістэматычная адсутнасць гарачай і халоднай вады | 85 | 7 | 1 | 1 |
| г) зношанасць разетак і праводкі | 77 | 14 | 3 | 0 |
| 5. Ці створаны аптымальныя ўмовы для самастойнага навучання ў сценах інтэрната? | 15 | 65 | 13 | 1 |
| 6. Ці адбілася на вучобе закрыццё чытальнай залі ў інтэрнаце №1? | 57 | 33 | 1 | 3 |
| 7. Ці хапае Вам спартыўных і культурных мерапрыемстваў? | 33 | 55 | 2 | 4 |

Прааналізаваўшы адказы на пытанні, прафбюро геаграфічнага факультэта высунула некалькі прапановаў па вырашэнні названых праблемаў:

1. Асноўная праблема – гэта праблема душа. Лічым за неабходнае правесці рамонт душавых кабінак дзеля няспыннага забеспячэння гарачай вадой. Прапаноўваем санітарны дзень скарацiць да 13.00.

2. Прапаноўваем падоўжыць гадзіны пропуску ў інтэрнат з 5.00 да 24.00 (для паўнагадовых) у сувязі з тым, што студэнты пасля дыскатэкі вымушаны стаяць пад дзвярыма да адкрыцця, нават зімой.

3. У анкетах бальшыня студэнтаў скардзіцца на старую мэблю, асабліва на ложкі. Неабходна больш хуткімі тэмпамі замяніць інвентар (па магчымасці).

4. У сувязі з вострым недахопам трэнажораў і спартыўных мерапрыемстваў неабходна лепшае фінансаванне спартыўнага жыцця студэнтаў. Па магчымасці, стварыць трэнажорную залю.

Праведзенае анкетаванне яскрава адлюстроўвае асноўныя праблемы, з якімі сустракаюцца студэнты інтэрната і на якія трэба звярнуць увагу. Па выніках апытання бачна, што студэнтаў у першую чаргу хвалююць бытавыя праблемы, звязаныя з умовамі пражывання (адсутнасць якаснай вады, старая мэбля, зношанасць разетак і праводкі). На вырашэнне гэтых задач і скіраваны асноўныя намаганні.

Іншая справа, ці хопіць у адміністрацыі універсітэта фінансавых сродкаў на вырашэнне ўсіх пастаўленых задач. Таксама трэба ўлічваць, што рэканструкцыя сістэмы водазабеспячэння патрабуе шмат часу і не можа быць здзейснена імгненна. Пры ўсім жаданні кіраўніцтва універсітэта дапамагчы студэнтам, неабходна ўлічваць той факт, што дзяржаўная падтрымка ВНУ знаходзіцца не на належным узроўні, таму вырашэнне ўсіх гэтых праблемаў у бліжэйшым будучым наўрад ці адбудзецца.

Неабходна таксама адзначыць, што некаторыя праблемы былі паспяхова вырашаны.

Так, усім жадаючым былі заменены старыя ложкі на новыя. Чытальная заля ў інтэрнаце №1 пачала сваю працу і ахвотныя ўжо могуць яе наведваць. Таксама, як стала вядома, універсітэт набыў у інтэрнат №2 новы тэнісны стол, і невялікая група студэнтаў стала ініцыятарам падрыхтоўкі памяшкання, дзе можна было б усталяваць гэты стол.

Праглядаючы анкеты, падаліся цікавымі некаторыя разважанні студэнтаў. Вось адно з іх:

"Перад паступленнем я лічыла, што студэнцкія гады – самыя шчаслівыя і вясёлыя. Гады прайшлі – і нават няма чаго ўспомніць. Нават да гадзіны ночы нельга затрымацца. А што такое гадзіна альбо дзве для моладзі? Нічога!!! Хто памятае сваю маладосць, той мяне зразумее."

Мы Вас разумеем.

Што да немагчымасці затрымацца ў інтэрнаце на большы час, то мы можам параіць заняцца гэтым пытаннем прафкаму. Актуальнай праблемай з'яўляецца таксама немагчымасць прымаць у інтэрнаце гасцей падчас сесіі. Як зазначыў рэктар БрДУ сп. М.Часноўскі на сустрэчы са студэнтамі геаграфічнага факультэта, ён не ведаў пра гэтую забарону і здзіўлены тым, што прадстаўнікі прафкама не ўздымалі гэтай праблемы.

Трэба дадаць, што пры ўзнікненні якіх-небудзь праблемаў альбо канструктыўных прапаноў, неабходна звяртацца да сябраў прафсаюзных камітэтаў сваіх факультэтаў, якія з'яўляюцца выразнікамі інтарэсаў студэнтаў і павінны разглядаць гэтыя пытанні. А вось калі праца студэнцкіх прафкамаў вас не задавальняе, то тут выйсце адно – мяняць склад прафкаму і абіраць сваімі прадстаўнікамі тых студэнтаў, у здольнасці якіх вырашаць тыя ці іншыя праблемы і адстойваць студэнцкія інтарэсы вы верыце.

**Віталь КОЎШ**

## ПОШТА ДЗЕДЗІЧА

**АСНОЎНЫМ ПАКАЗЧЫКАМ ІНТАРЭСУ ДА ТАГО ЦІ ІНШАГА ВЫДАННЯ ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ. У ЛІСТАХ, ШТО ПРЫХОДЗЯЦЬ У РЭДАКЦЫЮ «ДЗЕДЗІЧА», ГУЧЫЦЬ І КРЫТЫКА, І ПАДЗЯКА, І ПАРАДЫ ПА ЎДАСКАНАЛЬВАННІ НАШАЙ ПРАЦЫ. СЁННЯ МЫ ПРЫСВЯЧАЕМ ЦЭЛУЮ ПАЛАСУ НАЙБОЛЬШ ЦІКАВЫМ, НА НАШ ПОГЛЯД, ВЫКАЗВАННЯМ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ. ЯК ВЯДОМА, У ДОБРАЙ ДЫСКУСІІ НАРАДЖАЕЦЦА ІСЦІНА, І МЫ ЗАПРАШАЕМ ЦЯБЕ, ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ, НЕ ЗАСТАВАЦЦА ЎБАКУ, А ВЫКАЗАЦЬ СВАЁ МЕРКАВАННЕ ДА НАШАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, КАБ «ДЗЕДЗІЧ» НАЙБОЛЬШ АДПАВЯДАЎ ІНТАРЭСАМ БЕРАСЦЕЙСКАЙ МОЛАДЗІ.**

### ДЗЕНЬ ДОБРЫ, ДЗЕДЗІЧ.

*Хачу падзякаваць Вам за ліст і за падпіску на навіны. Вы пісалі пра тое, што важна адчуць падтрымку аднадумцаў ды зразумець, што ты не адзінокі ў сваіх перакананнях. І, атрымаўшы Ваш ліст, я адчуў гэта.*

*Даведаўся я пра існаваньне Вашай арганізацыі, калі натрапіў на вашую газету, прачытаў з цікавасцю. Радуе, што і ў нашым рэгіёне жыццё не стаіць на месцы, ёсць ІНФАРМАЦЫЯ.*

*І перамены прыйдуць абавязкова.*

**З павагай, andrus**

### ПРЫВІТАННЕ, АДНАДУМЦЫ!

*Маё імя Зміцер. Жыву я у горадзе Івацэвічы. Род заняткаў – вучоба. Падтрымліваю вас у тым, што тычыцца мовы. На жаль, пры сучаснай уладзе родная мова вымушана памерці. Толькі і чую кожны дзень: Расея, Расея, Расея. Абрыдла! Калі ласка, памяняйце сваё пашырэнне эл. пошты (ru) на by: усё ж, мы не маскалі.*

**Зміцер.**

**АД РЭДАКЦЫІ:** Паважаны Зміцер. Дзякуем за ліст і паведамляем, што наш электронны адрас dzedzich@mail.ru з'явіўся яшчэ ў тыя часы, калі беларускі інтэрнэт толькі пачаў нараджацца. А зараз змяніць афіцыйны адрас арганізацыі мы не можам, бо ўсе нашы партнёры яго ведаюць. Але ў нас ёсць і беларускі адрас: dzedzich@tut.by, так што можаце смела дасылаць свае лісты.

**Дзмітрый ШЫМАНСКІ**

### ПАВАЖАНЫЯ ДЗЕДЗІЧЫ!

*Дзякую за Ваш ліст. Пазнаёміўся з вашым сайтам. Вельмі рады, што ёсць яшчэ людзі, неабыякавыя да лёсу сваёй краіны. Вашы праграмы і напрамак дзейнасці заслугоўваюць павагі.*

*Мае юныя сябры! Да мэты, якую Вы абвяшчаеце, грамадства зусім не гатова. Мяркую, што галоўнай задачай з'яўляецца выхаванне нацыянальнай годнасці, любові да сваёй Радзімы, гонару за яе вялікую першасную мову і культуру. Трэба мець падтрымку ў масах.*

*Я саматугам намагаюся вырашаць праблемы, сугучныя з Вашымі. Можаце пазнаёміцца з маімі сайтамі:*
*http://ab13f.narod.ru (Адраджэнне мовы)*
*http://ab8vy.narod.ru (Родны край)*
*ды іншымі маімі творамі на сайце*
*http://ab0by.narod.ru*
*Пішыце, калі зацікавіцеся, працягнем размову.*

*З павагай і пажаданнем поспеху,*

**Анатоль Іванавіч БАЛУЦЕНКА, г.Пінск**

### ДОБРЫЙ ДЕНЬ!

*Вот взгляд со стороны. Вы как-то всегда начинаете "активничать" за месяц за два до выборов. А надо уже сейчас, по-моему, начинать разогревать ситуацию. Просто перед самыми выборами на избирателей обрушится такое количество информации, такое количество листовок, что половина, если не больше, будет лететь в корзину. А сейчас вы не будете иметь конкурентов в борьбе за время вашего возможного избирателя, а значит он прочитает ваши листовки.*

*Ведь большинство нормальных избирателей, по крайней мере тех, кого я знаю, на предвыборные листовки не обращают внимания. На них абсолютно не влияет то, что они прочтут в листовке перед выборами, так как они уже давно решили, за кого они будут голосовать. Особенно это относится к электорату Лукашенко. Они считают его лучшим, и даже не хотят ничего слушать, особенно всякие старички-экс-коммунисты.*


**Фота: ByMedia.net**

*У меня есть пример другой, более сложный. У меня знакомая, она имеет высшее образование, знает 5 языков. Ну, в общем, образованный и умный человек. Но она считает Лукашенко лучшим выбором. Она говорит про опозицию как прикормленных Западом. И что если она победит, то она повыкупает в Беларуси заводы, закроет их, и будет использовать Беларусь, как рынок сбыта.*

*Посоветуйте мне пожалуйста, что ей ответить. Ведь если я не могу переубедить одного человека в личной беседе, то как можно надеятся на то, чтобы переубедить человека в листовке. Это в тысячи раз сложнее.*

*У меня есть фильм о Лукашенко. Возможно вы его видели. Там очень хорошо показано его диктаторство. Жаль только, что он снят только в 1996 году. Получается, только за 2 года столько уже было о нём информации, что и фильм сняли. Может у Вас самих есть какието фильмы. Мне бы хотелось посмотреть. Чтобы знать, что ответить электорату батьки.*

*Вы писали, что у вас совсем нет экономических статей. Эта тема мне особенно интересна. И я мог бы помочь. Не знаю, как самому написать статью, но информацию для статьи я могу дать. Не знаю, читали ли вы книгу "Самый богатый человек в Вавилоне". Хорошая книга советую прочитать. Так вот, книга построена так, что она просто специально создана для взятия из неё информации для статьи. Можно, например, взять кусочек с особенно интересной историей (они короткие). И в газете или в листовке распечатать. И в конце можно написать, что полный текст этой книги можно скачать с вашего сайта. Зайдут, может, заинтересуются. И постепенно смогут и присоединиться к вашей организации.*

*ПРОСТО НУЖНО ДЕЙСТВОВАТЬ, а то со стороны кажется, что вы просто создаёте видимость того, что вы работаете, чтобы проедать зарубежные деньги, если таковые есть. В принципе никто под сомнение и не ставит, что они есть...*

*Это только моё видение ситуации и мои предложения по этому поводу. Возможно они не идеальны. Вы, наверное, на эту тему учились или у вас там есть профессионал по проведению таких акций.*

*Наверное, вам уже и читать совсем надоело. Особенно когда таких писем сотня в день. Успехов!*

**С уважением, Иван СОРОКА.**

**АД РЭДАКЦЫІ:** Паважаны Іван. Дзякуем за інтарэс да нашай дзейнасці. Мы вельмі ўдзячныя Вам за Вашыя канструктыўныя заўвагі, бо сапраўды час ад часу патрэбна паглядзець на тое, што робіш, вачыма незаангажаванага, а значыць аб'ектыўнага чалавека. Пагаджаючыся збольшага з крытыкай у адрас дэмакратычных сіл, адказваем на Вашы пытанні:

1. "Актыўнічаць" у гэты раз, улічваючы сумны досвед прэзідэнцкіх выбараў 2001г., мы пачынаем ужо зараз. Літаральна ў мінулым месяцы мы ўжо распаўсюдзілі 15 тыс. улётак з інфармацыяй пра выбары-2006. І гэта толькі пачатак.

2. Фільмаў пра сучасную сітуацыю ў Беларусі ў нас некалькі. Гэта "Звычайны прэзідэнт" і "Богі сярпа і молата" (Ю.Хашчавацкі), "Дзікае палянанне. Ч. 2" (П.Шарамет), "Пагоня за праўдай" (польская тэлевізія), фільмы пра знішчэнне ўладамі Беларускага гуманітарнага ліцэя, музычныя і мультыплікацыйныя замалёўкі пра нашу рэчаіснасць. І мы запісваем іх кожнаму, хто папросіць (на CD ці відэакасету).

3. А сваёй сяброўцы з вышэйшай адукацыяй проста парайце паменш глядзець БТ і паболей чытаць "Народную волю" ці "Нашу ніву", глядзець сайты www.charter97.org, www.svaboda.org. Тады яе ілюзіі наконт таго хто і што прадае ці плануе прадаць (і з якой мэтай), знікнуць. А калі яна эканаміст, то павінна ўсведамляць, што прыватныя прадпрыемствы працуюць значна больш эфектыўна, чым дзяржаўныя. Як нам уяўляецца, кемлівы гаспадар укладае грошы ў вытворчасць не для таго, каб яе спыніць, а каб атрымаць прыбытак. І калі ўлады не здольны арганізаваць працу "Цветатрона" ці ААТ "БЭМЗ", якія зараз жывуць выключна за здачу сваіх плошчаў у арэнду, то трэба знайсці такога інвестара, які затны гэта зрабіць. А клопат любой улады – сачыць, каб людзі мелі працу і атрымлівалі за яе нармальныя грошы.

**Андрусь ЛЯЎЧУК**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 2 ЧЭРВЕНЯ

Сёння, у пэўным сэнсе гэтага слова, садысцкі дзень. 2 чэрвеня 1740г. нарадзіўся французскі пісьменнік **маркіз дэ Сад**, ад прозвішча і сэксуальных прыхільнасцяў якога паходзіць тэрмін "садызм". Цяпер ён шырока ўжываецца не толькі ў дачыненні да сэксу, але і да іншых сфераў жыцця, у тым ліку і да паводзінаў дыктатарскіх рэжымаў.

Дзве наступныя каляндарныя даты – з гэтага шэрагу. 2 чэрвеня 1962г. у **Навачаркаску** ва Украіне савецкія ўлады расстралялі мірную дэманстрацыю рабочых. А 2 чэрвеня 1989г. на плошчы **Таньаньмынь** у Пекіне супраць мірнай студэнцкай дэманстрацыі былі кінутыя танкі. Больш за сто дэманстрантаў загінула. Сапраўды садысцкі дзень у нашым календары.

### 7 ЧЭРВЕНЯ



7 чэрвеня 1880г. нарадзіўся **Вацлаў Іваноўскі**. Ён прыйшоў на свет у шляхецкай сям'і ў маёнтку Лябёдка, недалёка ад мястэчка Васілішкі Лідскага павету. Рана ўсвядоміў сябе як беларус. У часе вучобы ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце ў 1902г. з групай аднадумцаў спрабаваў наладзіць выданне на гектографе падпольнай газеты "Свабода" як перыядычнага органа Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі. У 1906г. ўзначаліў славутую выдавецкую суполку "Загляне сонца і ў наша ваконца" у Пецярбургу. У ліпені 1913г. Іваноўскі пераехаў у Вільню, дзе стаўся старшынёю Беларускага выдавецкага таварыства. За два гады яно выдала 14 кніг агульным накладам блізу 45 тысячаў асобнікаў. Адначасова з актыўным удзелам у нацыянальна-вызвольным руху Іваноўскі займаўся навуковай дзейнасцю. У 1909г. у Мюнхене абараніў доктарскую дысертацыю і да 1913г. быў дацэнтам Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Вацлаў Іваноўскі стварыў першы падручнік неарганічнай хіміі для ВНУ на беларускай мове, шмат зрабіў у распрацоўцы нацыянальнай навуковай тэрміналогіі. У 1918г. ён – міністр асветы Беларускай Народнай Рэспублікі, рэктар Менскага педагагічнага інстытута. Да актыўнай палітычнай дзейнасці вярнуўся ў часе Другой сусветнай вайны. Акупацыю Беларусі разглядаў як часовую з'яву. Арыентаваўся на заходніх праціўнікаў Гітлера, а ў сувязі з гэтым – на польскі эміграцыйны ўрад у Лондане, разлічваючы на федэрацыю Беларусі і Польшчы ў паваеннай Еўропе. 6 снежня 1943г. Іваноўскі быў паранены на адной з вуліц Менска. Пакінуты ў шпіталі без лекарскай дапамогі, ён назаўтра памёр.

### 22 ЧЭРВЕНЯ

У гэты дзень фашысцкая Нямеччына напала на СССР.

### 24 ЧЭРВЕНЯ

У гэты дзень, 24 чэрвеня 1812г., пачалася вайна арміі Напалеона з Расеяй. За Напалеонам ужо была Польшча. Лішне казаць, што французска-

**(Заканчэнне на с. 7)**

# НЯЎЖО НЕ БУДЗЕ БЕЛАРУСАЎ?

## МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ



Мы працягваем змяшчаць на старонках нашага выдання творы маладых літаратараў, на якія так багата берасцейская зямля. Калі Вы жадаеце атрымаць аб'ектыўную адзнаку сваёй творчасці або проста Вам няма з кім падзяліцца сваімі літаратурнымі дасягненнямі – звяртайцеся да нас. Будзем радыя "прычыніцца" да запальвання новых літаратурных зорак. А пакуль, знаёмцеся:

**Раман Хцей.** 16 гадоў. Продкі паходзяць з Аўстрыі, таму ў яго такое незвычайнае прозвішча. Пачаў пісаць вершы ў 14 гадоў. Навучэнец УА "Берасцейскі дзяржаўны медычны каледж". Жыве ў Жабінцы.

### ЗНАК БЯДЫ

Будзе гром, навальніца будзе
На кургане, дзе спяць дзяды.
Гэта продкі табе, мой народзе,
З-пад нябёсаў шлюць знак бяды.

Наша мова яшчэ не забыта,
Герб "Пагоня" яшчэ не зыйшоў у нябыт.
Наша годнасць яшчэ не разбіта,
Нас ніколі не возьмуць на шчыт.

Нас ніколі не возьмуць на дзіду.
Я табе ў гэтым шчыра клянусь.
Паглядзі на світанне наўкола
І адчуй, што Жыве Беларусь.

Дзе ж вы нашы Францішкі Скарыны?
Дзе вы, слаўныя нашы сыны?
Не дадзім Белай Русі стаць Чорнай,
Адрадзім слаўны час даўніны!

### ДАЙЦЕ МНЕ КРЫЛЫ

Дайце мне крылы, каб мог паляцець
У неба блакітнае.
Дайце, каб мог на хвіліну забыць
Гора штодзённае.
Дайце, бо нельга далей мне тут жыць
На брудным гэтым свеце.
Дайце, бо абрыдла мне тут ўсё,
Цяжка тут жыць, паверце.
Цяжка свабоднай душы жыць у прыгнёце
Нашай улады.
Цяжка, бо трэба выконваць
Нечалавечыя яе загады.
Цяжка, бо не ў сілах я змяніць
Наша становішча агіднае.
Дайце мне крылы, каб мог паляцець
У неба блакітнае.

### РАЗВІТАННЕ З РАДЗІМАЙ

Няўжо нічога больш не вернеш?
Няўжо згнаілі час дарэмна?
Няўжо ніколі больш не ўбачу
Сваю краіну незалежнай?

Няўжо ніколі не пачую
Я больш сваю родную мову?
Няўжо ніколі не ўбачу
Наш герб – Літоўскую "Пагоню"?

Няўжо наш бел-чырвона-белы сцяг
Не ўзаўецца больш над намі?
Калісь ён быў у нас дзяржаўным –
Цяпер ляжыць ён пад нагамі.

Няўжо ўсе тыя намаганні
Купалы, іншых – усе дарэмны?
Няўжо ўвесь лад нашай дзяржавы
Застанецца зусім не зменным?

Няўжо мы так і будзем жыць,
Забыўшы лад свой і культуру?
Няўжо адыдзем у нябыт,
Няўжо не будзе беларусаў?..

Здаецца, мае словы ўсе дарэмны –
Не зменіш больш нічога ў жыцці.
Збірайся брат, няма нам месца
Больш на гэтым свеце.
Збірайся, брат, у дарогу, і пайшлі…

# ДЕНЬ

**СОВСЕМ НЕДАВНО НАШЕМУ ГОРОДУ СТУКНУЛО 985 ЛЕТ. В СВЯЗИ С ЭТИМ НАМ ХОРОШО ЗАПОМНИЛОСЬ ТЁМНОЕ НЕБО, РАСЧЕРЧЕННОЕ ОГНЯМИ ФЕЙЕРВЕРКА, ВКУС ТЕПЛОВАТОГО БРЕСТСКОГО ПИВА И ПРЕЙСКУРАНТ ЦЕН В ПАЛАТКАХ РАССТАВЛЕННЫХ НА КАЖДОМ УГЛУ. НО НЕ КАЖДЫЙ ПОМНИТ ОТВЕТ НА ВОПРОС – А ПОЧЕМУ ИМЕННО 985?**

Ещё в школе добрые учителя истории объясняли нам, что возраст города исчисляют от его первого упоминания в летописи. О Берестье впервые написано в старейшем славянском фолианте – в Повести Временных Лет. Это упоминание имеет важное историческое, и, извиняюсь за мистицизм, СИМВОЛИЧЕСКОЕ значение. Итак, предистория.

Крестителя Руси, князя Владимира, сегодня часто можно видеть на иконах, где написано "равноапостольный святой", современники же называли его по-домашнему ласково – Владимир Красно-Солнышко. Так вот, этот замечательный человек неожиданно умер, оставив после себя сыновей: юных Бориса и Глеба, Ярослава и старшего Святополка.

Борис и Глеб – близняшки, имели около двадцати лет от роду, и были младшими, любимыми сыновьями умершего князя. Старший Святополк решил устранить претендентов на престол, бывших папенькиных любимчиков и приказал убить обоих. Так на земле Русской появились первые святые мученики – Борис и Глеб. Чёрный люд уже тихонечко называл нового князя меж собой то Окаянным, а то Поганополком.

Для полного счастья Святополку оставалось укокошить среднего брата, Ярослава. Но сын Рогнеды и сам был не промах. Правда, пока его ещё называли не Мудрым, а Хромым… Что ж, физические недостатки больше бросаются в глаза, нежели духовные достоинства. Итак, внук Рогволода начал войну против Святополка и после долгих кровопролитных стычек с Божьей помощью одержал победу. Святые Борис и Глеб

*Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына... (Я. Купала)*

# КАБ НЕ ЎМЁРЛІ

## ЧАМУ ТРЭБА ЗАХОЎВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ КУЛЬТУРУ

**СЁННЯ НАША КУЛЬТУРА ПЕРАЖЫВАЕ ВЕЛЬМІ СКЛАДАНЫ ПЕРЫЯД. У ВЫНІКУ ГІСТАРЫЧНАГА ЛЁСУ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ ШМАТ КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА БЫЛО СТРАЧАНА.**

Аднойчы еду ў тралейбусе. На адным з прыпынкаў увайшоў пажылы чалавек, прысеў і вымавіў: "Я говорю на языке оккупантов. Пришли оккупанты и забрали у нас нашего Бога, наш язык." Шмат з тых, хто ехаў у тралейбусе, паглядзелі на яго як на чалавека, які з глузду з'ехаў, але мала хто з іх задумаўся над гэтымі словамі.

Як магчыма забраць у народа Бога? Варта ўзгадаць 1839 год, калі ўніяцкую царкву прымусова аб'ядналі з праваслаўнай, тым самым забраўшы ў беларускага і літоўскага народаў нацыянальную рэлігію, якая ўзнікла ў выніку складаных адносін паміж каталікамі і праваслаўнымі і ўратавала наш народ ад гвалтоўнай паланізацыі.

У часы 2-й Сусветнай вайны шмат гістарычных помнікаў Беларусі было разрабавана і зруйнавана. Знік крыж Еўфрасіні Полацкай – духоўны сімвал нашай краіны, створаны ў 1161г. выдатным майстрам Лазарам Богшай. Шмат помнікаў беларускай культуры знаходзіцца зараз у музеях Расеі і іншых дзяржаў, а не на Бацькаўшчыне.

Самае жудаснае тое, што нават у наш мірны час духоўных каштоўнасцяў беларусаў становіцца ўсё менш: зніклі шляхам рэферэндуму 1995г. гістарычныя сімвалы незалежнасці нашай краіны – бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня". Але ёсць людзі верныя сваёй гістарычнай мінуўшчыне, якія і сёння жывуць пад бел-чырвона-белым сцягам. Варта ўзгадаць пахаванне апостала беларускай мовы Васіля Быкава, які памёр 22 чэрвеня 2003г. 25 чэрвеня, на пахаванні бацькі, сын накрыў яго труну бел-чырвона-белым сцягам.

Пужае таксама тое, як ставяцца да гістарычных помнікаў сучасныя беларусы. Тут не трэба шмат слоў, варта толькі паглядзець на стан Ружанскага і Касаўскага палацаў: папісаныя сцены, бруд паўсюль, куды ні кінь вокам. І гэта датычыцца шмат якіх помнікаў дойлідства Беларусі.

На нашых вачах знікае з гэтага свету мабыць самы галоўны элемент нацыянальнай культуры – родная мова. Праблема мовы доўжыцца ўжо не адно стагоддзе. Парадокс жыцця: раней, пры царскай уладзе, беларуская мова была забаронена, але на ёй размаўлялі амаль усе людзі "Паўночна-Заходняга краю". Зараз жа, калі яна з'яўляецца дзяржаўнай, вельмі мала людзей выкарыстоўваюць яе для гаворкі. Больш за тое, на людзей, якія размаўляюць на роднай мове, глядзяць як на нейкіх іншаземцаў ці лічаць іх жыхарамі вёсак. Прыклад з майго жыцця: калі я купляў квіток на тралейбус, я звярнуўся да прадаўца па-беларуску. ¨н пагледзеў на мяне не як на свайго земляка, а як на нейкага амерыканца, усміхнуўся і толькі тады даў мне квіток. Пужае той факт, што кіраўніцтва нашай дзяржавы не праводзіць аніякай палітыкі па развіцці роднай мовы. Наконт рэферэндуму 1995г. выдатны беларускі пісьменнік І.Шамякін сказаў: "Галасавалі за дзвюхмоўе, а атрымалі перавагу адной – расейскай".

Францішак Багушэвіч пісаў у прадмове да "Дудкі Беларускай": "Шмат было такіх народаў, што найперш страцілі мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!" Гэтыя словы найбольш яскрава адлюстроўваюць ролю мовы для народа. Не ўсе народы маюць родную мову, беларусам жа дадзены такі скарб, трэба толькі яго зберагчы, не даць знікнуць.

Наша культура значна збяднела ў выніку тых выпрабаванняў, якія наканаваў лёс нашай шматпакутнай зямлі. Так не дазвольма знікнуць таму, што яшчэ засталося! Яшчэ не вывеліся такія людзі, што ў сілах адрадзіць нашу спадчыну. Варта ўзгадаць Мікалая Кузьміча, які зрабіў копію крыжа Еўфрасіні Полацкай.

Досыць пакутаваць нашай зямлі! Будзем жа шанаваць яе гістарычныя помнікі, памятаць яе мінуўшчыну! Дзе ж вы, майстры беларускага слова? Узбагачайце родную літаратуру! Не дазволім нашай мове стаць мёртвай сястрой латыні.

**Раман ХЦЕЙ**

# РОЖДЕНИЯ ГОРОДА

были отомщены. А Святополк бежал. И когда проезжал он мимо Берестья, напал на него бес и расслабли все члены его, и не мог он сидеть на коне, и несли его на носилках. Страдающий от боли, одержимый манией преследования, с постоянным криком: "Вот уже гонятся, ой, гонятся, бегите!!!" он добрался до некого пустынного места между Польшей и Чехией, где и скончался. А от могилы Святополка, согласно легенде, исходил страшный смрад, который не позволял никому приблизиться к проклятому месту.



**Рэшткі летапіснага Берасця XIIIст. можна сёння ўбачыць у музеі «Бярэсце»**

Минула почти тысяча лет с тех пор, когда под Брестом небесная кара настигла изувера Святополка, убийцу святых Бориса и Глеба. Но и сегодня мы отмечаем этот день торжества небесной справедливости как день рождения нашего города.

**Алеся КРАСЬКО**

**АД РЭДАКЦЫІ:** Пакідаючы за аўтарам адказнасць за падбор інфармацыі і фактаў, адзначым, што пытанне аб тым, ці быў Яраслаў Мудры сынам Рагнеды, у гістарычнай навуцы да сёння застаецца спрэчным. Існуе думка, што кіеўскія князі абвясцілі Яраслава сынам Рагнеды, каб апраўдаць свае прэтэнзіі на Полацкае княства.

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

(Заканчэнне. Пачатак на с. 6)

расейская вайна адбывалася пераважна на Беларусі. Паўмільённае войска Банапарта фарсіравала Нёман. Цару Аляксандру І паведамілі пра гэта, калі ён танцчыў на балі ў Вільні. Праз чатыры дні былая сталіца ўжо вітала французскага імператара. Роўна праз месяц пасля Вільні ён уступіў у Віцебск. Нягледзячы на цяжкія страты ды ваенныя няўдачы пад Кобрынем, Мірам і Полацкам, Банапарт прайшоў ад памежнага Нёмана сотні вёрстаў і набыў пяць мільёнаў новых падданых. Усведамленне гэтага дапамагала аспрэчыць думкі і пра частае дэзертырства, і пра сялянскія бунты, і пра тое, што ў ягоных беларускіх палках замест сотні тысячаў жаўнераў у лепшым разе толькі чвэрць гэтага, і тым бракуе рыштунку і зброі. Па беларускіх вёсках, пакідаючы за сабой пустыя хлявы і адрыны, гойсалі рэквізітары. Паколькі землі былога Вялікага Княства Літоўскага Напалеон лічыў вызваленымі з-пад расейскага прыгнёту, была ўтвораная Камісія Часовага Ураду Вялікага Княства. Яна прысягнула на вернасць імператару, гэта значыць, што Беларусь фармальна была абвешчаная саюзніцаю Францыі. Напалеонаўская авантура каштавала Беларусі мільён яе жыхароў, кожнага чацвертага. Адныя загінулі ў баявых дзеяннях, другія – ад голаду і пошасцяў. Частка беларускіх палкоў Вялікай арміі, у якіх служылі 25 тысячаў нашых суайчыннікаў, была разбітая, частка адступіла і ваявала ў Еўропе – на чужыне і за чужыя інтарэсы.

### 27 ЧЭРВЕНЯ

27 чэрвеня 1929г. у савецкай Расеі прынята рашэнне разгарнуць сетку папраўча-працоўных лагераў па ўсёй краіне – яшчэ толькі ствараецца чорнай памяці ГУЛАГ.

### 28 ЧЭРВЕНЯ

**Дзень памяці Янкі Купалы.** Пісьменнікі і проста грамадзяне ў гэты дзень традыцыйна ўскладаюць кветкі да помніка Купалу на Вайсковых могілках у Менску. Між тым, таямніца смерці песняра застаецца нераскрытаю. Купала загінуў 28 чэрвеня 1942г. у маскоўскім гатэлі "Масква". Паэт вярнуўся з вечарыны з іншымі пісьменнікамі ў свой нумар і па дарозе ўпаў у лесвічны пралёт. Нехта быццам бы бачыў, як пасля гэтага з гатэлю выбягалі нейкія людзі... Цэлыя кнігі пра гэтую трагічную смерць напісалі Б.Сачанка і Г.Колас, але ўсе версіі так і засталіся адкрытымі: самагубства, КДБ, нямецкія агенты... Вельмі няўтульнае, прызнаюся, пачуццё, калі народ не толькі не збярог свайго найвялікшага паэта, але і нічога не ведае пра прычыны ягонай гібелі. Сяржук Сокалаў-Воюш прысвяціў гэтай падзеі выразны верш, дзе ёсць такое рытарычнае запытанне: "Мо быў улетку галалёд у тым гатэлі?" Магчыма, таямніца гібелі Янкі Купалы раскрыецца разам з адкрыццём архіваў КДБ, якія сёння ў Беларусі не даступныя нікому.

### 30 ЧЭРВЕНЯ

30 чэрвеня 1908г. упаў **Тунгускі метэарыт**. Катастрофа адбылася ў Цэнтральнай Сібіры. Сведкі параўноўвалі метэарыт з вогненным бервяном у небе. Пры гэтым само неба раўло ды грукатала. Пасля падзення метэарыту зямля гайданулася ў людзей пад нагамі, а выбух чуваць было за тысячу кіламетраў ад месца здарэння. Падалі дрэвы, з вокнаў выляталі шыбы. Радыус выбуху склаў 30 кіламетраў. Гукавая хваля двойчы абышла зямны шар і была зафіксаваная ў Вашынгтоне, Лондане, Джакарце ды іншых гарадах.

# Свет у зялёным колеры

**НА ДВАРЫ XXI СТАГОДДЗЕ, І МОЛАДЗЬ ШУКАЕ НОВЫХ МЕТАДАЎ ДЛЯ ЗНЯЦЦЯ СТРЭСУ. ЯЕ ЎЖО НЕ ВАБІЦЬ АЛКАГОЛЬ, І ЎСЁ ЧАСЦЕЙ ЯНА БЯРЭ Ў РУКІ БУЛЬБУЛЯТАР І КУРЫЦЬ З ЯГО КАНОПЛЮ.**

Сапраўды, амаль уся моладзь ведае што такое бульбулятар і як ім карыстацца. Пасля прыняцця каноплі няма паху з рота (як ад алкаголю), назаўтра не баліць галава, і ўвогуле, яна пераносіць цябе ў свет нерэальнага, дае магчымасць адчуць стан нірваны. Але ці добра гэта?

Медыкамі даказана, што канопля аказвае моцнае дзеянне на нервовую сістэму, асабліва на памяць. Пры чым дзеянне гэта зусім не станоўчае. У мяне ёсць знаёмы, які прымаў каноплю штодня. Гэтак працягвалася каля года, пасля чаго памяць яго на столькі пахіснулася, што калі ён ішоў у краму, дайшоўшы да яе ён забываў што трэба набыць. І гэта зусім не смешна. Але самае жудаснае ў гэтым тое, што ў пэўны момант асалоды, якую дае канопля, перастае хапаць, і чалавеку хочацца чагосьці большага. І тады ён пачынае пераходзіць на больш цяжкія наркотыкі, напрыклад, амфетамін, які ў сваім асяроддзі называюць "амфік" ці проста "вітамін". Далей і амфетамін перастае адказваць патрабаванням цела чалавека, і ў рэшце рэшт чалавек пераходзіць на такія цяжкія наркотыкі, як гераін. Пужае тое, што, нягледзячы на гэта, усё больш моладзі зацягваецца ў кола "траўнікаў".

Я сустрэўся з адным з такіх людзей, якія знаходзяцца на мяжы пераходу ад каноплі да больш цяжкіх наркотыкаў. У яго ёсць праблемы з міліцыяй (якраз такі за "зялёныя" справы), таму ён пажадаў, каб яго імя не указвалася.

**– У якім узросце ты ў першы раз паспрабаваў паліць каноплю?**

– Точно не помню, где-то в 14-15 лет.

**– Што табе ў гэтым падабаецца?**

– Ну что... Запаха изо рта нет, голова с утра не болит, да и просто ощущения классные.

**– Якім чынам ты знаходзіш яе для сябе?**

– Летом в основном собираю, план кручу, а вот зимой приходится покупать.

**– Колькі яна каштуе?**

– «Корабль» (спичечный коробок) –10 долларов, «половинка» (пол спичечного коробка) – 5 долларов, стакан (200 граммовый) – 50 долларов. Можно «штык» купить – 2,5 доллара... Ну, в общем, не очень дёшево.

**– Ці спрабаваў ты яшчэ якія-небудзь наркотыкі акрамя каноплі?**

– Пробовал амфик пару раз.

**– Чаму ты яго паспрабаваў?**

– Да трава перестала прикалывать. Хотелось чего-то большего.

**– Ты жадаў бы спыніцца?**

– Конечно, но, по-моему, это уже бесполезно: я подсел.

**– Як ты лічыш, наркотыкі – гэта добра ці кепска?**

– Ничего хорошего в этом нет. Я бы сам давно завязал, но вот что-то не получается. Поэтому никогда не пробуйте наркотиков, пусть даже это просто конопля, с неё-то всё начинается. И я уже сам не знаю, чем всё это закончится...



Фота: ByMedia.net

**Гэты хлопец дакладна ведае, што такое канопля**

**Гутарку вёў Раман ХЦЕЙ**

# Магія чорная, магія белая

**ГЭТЫМ АРТЫКУЛАМ МЫ РАСПАЧЫНАЕМ ВЯЛІКУЮ І, СПАДЗЯЕМСЯ, ЦІКАВУЮ СЕРЫЮ, ПРЫСВЕЧАНУЮ АДНОЙ З НАЙБОЛЬШ ЗАГАДКАВЫХ І ТАЯМНІЧЫХ ПРАЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ – МАГІІ.**

У наш час, калі кампутары ды мабільныя тэлефоны надзейна ўвайшлі ў паўсядзённае жыццё, а дапытлівымі вучонымі былі раскрыты сакрэты структуры бялку ды чалавечых генаў, менавіта магія і яе праявы засталіся тым абшарам, які не паддаецца рацыянальнаму тлумачэнню, а таму і прыцягвае рамантыкаў ды шукальнікаў прыгод або, наадварот, расчараваных у жыцці людзей.

"Магія (ад грэцкага mageia – "чараўніцтва") – абрады, звязаныя з верай у надзвычайную здольнасць чалавека (чараўніка, мага) уздзейнічаць на людзей і з'явы прыроды. Узнікла падчас першабытнаабшчыннага ладу і стала элементам абрадаў" – вось і ўсё, што можна знайсці ў сучасным тлумачальным слоўніку.

Сапраўды, вытокі магіі можна знайсці ў ранняй родавай абшчыне, калі існавалі такія формы вераванняў, як анімізм (вера ў існаванне духаў, антрапамарфізацыя розных сіл прыроды, жывёлаў, раслін і г.д.); татэмізм (вера ў сувязь, радство паміж групай людзей і пэўным відам жывёлаў, раслін); фетышызм (надзяленне прадметаў прыроды звышнатуральнымі якасцямі). Лёгка можна заўважыць, што з ўсіх узгаданых першасных вераванняў да нашых дзён пратрывала толькі магія, прычым гэты шлях быў даволі складаны і разнастайны: магія перажывала то ўздымы (алхімія і г.д.), то глыбокі заняпад (сярэднявечча і славутая барацьба з ведзьмамі).

Што тычыцца Беларусі, то да прыходу хрысціянства на нашых землях атрымала распаўсюд паганства – форма рэлігіі, заснаваная на ідалапаклонстве і веры ў некалькіх багоў, сярод якіх галоўнае месца займалі Пярун, Сварог, Лада, Стрыбог, Велес. З прыходам хрысціянства паганскі светапачатак набыў антыхрысціянскае значэнне і ў гэтым кантэксце выкарыстоўваўся для барацьбы духавенства з праявамі рэлігійнага іншадумства. Пры гэтым людзей, якіх абвінавачвалі ў чараўніцтве, у лепшым выпадку выганялі з вёсак і гарадоў, а ў горшым – забівалі.

Само паганства з'яўлялася сінкрэтычным па сваім характары і, абапіраючыся на магію, аб'ядноўвала ў сабе рэшткі фетышызму, анімізму і сонечнага культу.

Да праяў фетышызму адносіцца такая з'ява, як пакланенне Агню. Гэтая рыса характэрна ўсім першасным цывілізацыям і народам: у старажытным Рыме ў храме Весты гарэў вечны агонь, у колішняй Літве перад істуканам Перкунасам вайдалоткі ўвесь час палілі дуб, падтрымліваючы такім чынам нязгаснае вогнішча Зьніч.

У старажытных беларусаў агонь з'яўляўся адным з асноўных кампанентаў сям'і. Пры дапамозе агню людзі бараніліся ад цёмных сілаў, варажылі.

Наступная стыхія, якой пакланяліся нашыя продкі – гэта Вада. Дагэтуль захавалася шмат сведчанняў у летапісах аб пакланенні вадзе і ахвярапрынашэнні. Яшчэ са старажытных часоў нашыя продкі верылі ў магічную і лячэбную сілу вады. Прычым "жывой" вадой на Беларусі называлі ваду з крыніц. Апошняя, як і агонь, выкарыстоўвалася для варажбы і чараўніцтва. Старажытныя беларусы верылі ў тое, што ваду для піцця неабходна трымаць закрытай, інакш у яе можа ўвайсці нячыстая сіла.

Яшчэ адной стыхіяй, якую шанавалі нашыя продкі, з'яўлялася Зямля. Выпраўляючыся ў далёкія краіны, старажытны беларус зашываў у тканіну жменю роднай зямлі: калі прыйдзецца памерці на чужыне, то ягоны прах будзе пахаваны разам з роднай зямлей. А самай страшэннай клятвай для беларусаў была клятва, вымаўленая з зямлёю ў вуснах або ў руках – калі чалавек схлусіць, то пачарнее, як зямля. У заклёццях і чарах зямля выступае таксама часта, як і агонь.

На гэтым разгляд праяў фетышызму ў старажытных вераваннях беларусаў можна спыніць. У наступным артыкуле мы паспрабуем разгледзець больш цікавыя і загадкавыя сляды анімізму і татэмізму ў першасным светаўспрыманні нашых продкаў.

**Андрусь ЛЯЎЧУК**

# БІТВА ЗА 75%

**З 1 СТУДЗЕНЯ 2005г. МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ ЎСТАНАВІЛА КВОТУ НА ГУЧАННЕ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ НА АЙЧЫННЫХ РАДЫЁСТАНЦЫЯХ – 75%. ТАКІМ ЧЫНАМ ДЗЯРЖАВА ВЫРАШЫЛА ДАПАМАГЧЫ НАШЫМ МУЗЫКАМ ЗАНЯЦЬ ЛІДЫРУЮЧЫЯ ПАЗІЦЫІ Ў СВАЁЙ КРАІНЕ.**

Вынікі прынятых мер не прымусілі сябе чакаць: радыёстанцыі пачалі мяняць фармат, а тыя, што засталіся верныя сабе – атрымалі папярэджанні.

Выкананне ж 75-працэнтнай квоты беларускай музыкі ў эфіры, па сведчанні даследчай лабараторыі NOVAK, выклікала падзенне рэйтынгу радыёстанцый у сярэднім на 10%.



**Лявон Вольскі, саліст гуртоў «N.R.M.» і «Крамбамбуля», якія не патрапілі ў спіс «правільных» выканаўцаў.**

Міністэрства інфармацыі ўжо вынесла папярэджанні за невыкананне зададзенага працэнта шасці радыёстанцыям. Гэта "Альфа Радыё", "Радыё Рокс", Пілот-FM", "Юністар", "Новае радыё" і "Хіт FM".

За працэнтнымі адносінамі беларускай музыкі да ўсёй астатняй асабіста сочыць міністр інфармацыі, якому кожную раніцу кладуць на стол лісток з такімі дадзенымі. Крытэрам забеспячэння 75-працэнтнага напаўнення FM-эфіру песнямі беларускіх аўтараў і выканаўцаў з'яўляецца колькасць музычных кампазіцый. Агульная колькасць прагучаўшых за суткі песень прымаецца за 100%. За 24 гадзіны вяшчання ў эфіры радыёстанцый гучыць 250 - 350 музычных кампазіцый. Такім чынам, у суткі на кожнай FM-хвалі павінна гучаць ад 180 да 270 фанаграм беларускіх аўтараў і выканаўцаў. Пры гэтым было падлічана, што для таго, каб радыёстанцыя працавала ў сваім звычайным рэжыме, кожны тыдзень на рынку айчыннай музыкі павінна з'яўляцца як мінімум 15 новых кампазіцый! За першыя тры тыдні 2005г. радыёстанцыі не атрымалі ніводнай (!) свежай песні ад беларускіх выканаўцаў.

Цяпер зразумела, чаму FM-станцыі адна за адной атрымліваюць папярэджанні: ім проста няма чым запаўняць эфір! Як кажуць, круціся, як хочаш.

Карцінку", так бы мовіць, завяршае сітуацыя з дзесяццю беларускімі рок-гуртамі ("N.R.M.", "Нейра-Дзюбель", "Палац" і інш.), якія ўдзельнічалі ў канцэрце падчас акцыі беларускай апазіцыі летам 2004г. і цяпер "адлучаны" ад эфіру, а іх творчасць, па-сутнасці, забаронена.

Затое Міністэрства інфармацыі прапанавала свой спіс беларускіх аўтараў і выканаўцаў, чые песні настойліва "рэкамендаваны" для праслухоўвання. А паколькі сэнс слова "рэкамендацыя" ў нас да вядомай ступені звульгарызаваны, а "не ўключаны ў спіс" значыць "забаронены", то аматарам беларускага радыёэфіру будзе яшчэ доўга спяваць пра выдуманую ім "Беларусію" Кірыл Слука і падобныя яму. А эфір паступова напаўняе рэтра, шансон і нізкаякасная беларуская папса.

Па песімістычных прагнозах ужо праз 6-8 месяцаў некаторыя радыёстанцыі перастануць існаваць. Людзі ўклалі ў радыё грошы, рызыкнулі, заваявалі частку рынку, і раптам ім зверху навязваецца музычная цэнзура. Навязванне дзяржавай пэўнага фармату ўсім станцыям – гэта канец FM-вяшчанню.

Кампрамісным варыянтам для падтрымкі і захавання беларускай музыкі мог бы стаць прадзяржаўны радыёканал, які меў бы права на некамерцыйнае існаванне таму, што фінансаваўся б з дзяржаўных крыніц (да прыкладу, нізкарэйтынгавы расейскі TV-канал "Культура", канал для інтэлігенцыі, дзе цэлыя суткі можна глядзець фільмы Антаніёні і Таркоўскага, лепшыя пастаноўкі маскоўскіх тэатраў). Калі ласка, "круціце" сабе ўвесь беларускі музычны прадукт. Лепшыя выканаўцы праб'юць сабе шлях на іншыя хвалі. А цэнзура яшчэ ніколі не ажыўляла нацыянальнае мастацтва. Вартая таго беларуская музыка сама знойдзе сабе шлях да эфіру, якасная беларуская музыка заўсёды гучала і будзе гучаць на ўсіх FM-станцыях.

Міністэрствам інфармацыі сумесна з Міністэрствам культуры адабраны наступны спіс аўтараў і выканаўцаў для трансляцыі іх музычных твораў у FM-эфіры:

– дзяржаўная ўстанова "Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры" (мастацкі кіраўнік У. Шарапаў);

– ансамбль "Сябры" (мастацкі кіраўнік – народны артыст Беларусі А. Ярмоленка);

– дзяржаўная ўстанова "Заслужаны калектыў Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь" (мастацкі кіраўнік – народны артыст Беларусі М. Фінберг);

– заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Я. Навуменка, Я. Паплаўская, А. Ціхановіч, А. Ісаеў;

– лаўрэаты міжнародных конкурсаў І. Афанасьева, І. Дарафеева, І. Абалян, Р. Аляхно, В. Алешка, П. Смолава, Г. Абасава;

– артысты А. Хлястоў, А. Сухароў, К. Слука, А.Ярмоленка (Алеся), В. Плотнікава, Г. Шышкова, Л. Грыбалёва, С. Сухамлін, В. Дземянчук, В.Ухцінскі, А. Саладуха, А. Сямёнаў, Улада, Р. Мусвідас, В. Каменева (Веста), А. Звяровіч, О. Змуршчык, Я. Ліпніцкая (Яна), З. Белы, С. Шаптуноў, А. Скараход, С. Мінскі, О. Мілая, Ж. Бутэрус (Janet), А. Качына (Corriana), Г. Калдун;

– гурты "Беларускія песняры", "Новы Іерусалім", "Харлі", "Камерата", "Троіца", "Эківокі", "Stocks", дуэт "Аляксандра і Канстанцін", "J-Mors", "Лепрыконсы", "Ляпіс Трубяцкі", "Атлантыка", "Цягніштурхай", "Савана", "Патрыёт", "Apple tea", "Madera Hard Blues", "Neo", "Чысты голас", "Vox", "Black sugar", "Вінілавыя сны", "Медуза".

Улічваючы недастатковае развіццё айчыннага шоў-бізнесу і, як вынік, аб'ектыўны недахоп беларускіх кампазіцый для забеспячэння паўнацэннага, разнастайнага кругласуткавага эфіру з разліку прапорцыі 75%, Міністэрства інфармацыі прапануе лічыць айчыннымі выканаўцамі выхадцаў з Беларусі (этнічных беларусаў), якія зараз пражываюць за яе межамі. Прапануецца лічыць беларускай музыкай выкананне замежных песень і кампазіцый беларускімі музыкамі, cover-версіі замежных кампазіцый, музычныя праграмы, падрыхтаваныя беларускімі ды-джэямі, а таксама творы з аранжыроўкамі беларускіх музыкаў і творы гуртоў, у складзе якіх працуюць беларускія музыкі.



**«Нерэкамендаваны» бард і акцёр Віктар Шалкевіч**



**Ігар Варашкевіч і гурт «Крама» – папулярны, але «неблаганадзейны» выканаўца.**

Такім чынам, прапануем дадатковы спіс:

– сольныя выканаўцы: Анжаліка Агурбаш, Аляксандра Гайдук, Наталля Падольская, Алёна Свірыдава і інш.

– гурты: "Краскі", "Сястра", "Лета", "Бі-2", "Рэфлекс" і інш.

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# ДВОЙЧЫ ЧЭМПІЁНЫ

**23 ТРАЎНЯ АДБЫЛАСЯ ФІНАЛЬНАЯ СУСТРЭЧА НА КУБАК БЕРАСЦЕЙСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ПА ФУТБОЛЕ, У ЯКОЙ СУСТРАКАЛІСЯ КАМАНДЫ ГЕАГРАФІЧНАГА І ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТАЎ.**

Барацьба за кубак пачалася з кваліфікацыйнага раунда, у якім высвятлялі адносіны каманды факультэтаў дашкольнага выхавання і псіхолага-педагагічнага, дзе мацнейшымі аказаліся футбалісты дашфака. У другой пары сустракаліся каманды гістарычнага і філалагічнага факультэтаў. Перамогу святкавалі гісторыкі. Такім чынам, чвэрцьфінальныя пары сталі выглядаць так: геаграфічны-матэматычны; гістарычны-дашкольнага выхавання; юрыдычны-замежных моў; фізічны-біялагічны факультэты.

Гульні ўразілі накалам, а таксама нечаканымі вынікамі. Напрыклад, здзіўленне выклікала перамога гісторыкаў над "дашфакам", які лічыўся да пачатку спаборніцтваў адным з прэтэндэнтаў на пападанне ў фінал. Але гэта быў не іх дзень, лік 4:1 – і далей ідуць гісторыкі. На гэтым этапе спаборніцтваў амаль не атрымала супраціўлення каманда фізічнага факультэта, якая з лікам 6:1 перамагла каманду біялагічнага факультэта. Вельмі цікавым выдаўся матч географаў з камандай матэматычнага факультэта. Было дастаткова шмат добрых камбінацый, але фартуна ды лепшая рэалізацыя галявых момантаў вывелі каманду геафака ў паўфінал, гульня скончылася з лікам 3:1 на іх карысць. А гульня юрыстаў з "замежнікамі" не адбылася ўвогуле: каманда факультэта замежных моў не з'явілася на гульню і ёй было залічана тэхнічнае паражэнне. Гэта дало камандзе юрыдычнага факультэта яшчэ адзін дзень адпачынку.

Гэты дзень адпачынку мабыць і стаў для юрыстаў тым неабходным фактарам для перамогі над фізікамі. Юрысты дамінавалі на працягу ўсёй сустрэчы, не даючы падставаў для сур'ёзных атак на свае вароты. Гульня завяршылася з лікам 5:1 на карысць каманды юрыдычнага факультэта, якая адправілася чакаць выніка сустрэчы географаў з гісторыкамі. Гэтую сустрэчу каманда геаграфічнага факультэта правяла значна лепш, чым папярэднюю. Географы дамінавалі на полі і не далі гісторыкам магчымасці праявіць сваіх лепшых якасцяў. Галы былі на любы густ і выклікалі ў гледачоў шмат добрых эмоцый. Сустрэча завяршылася з лікам 4:1 на карысць географаў.

Фінальная сустрэча, якая была прызначана на 19 траўня, не адбылася, бо футбольнае поле СШ №9, дзе праходзілі спаборніцтвы, пасля начнога дажджу ператварылася ў вялікую лужыну, у якой хутчэй можна было праводзіць спаборніцтвы па водным пола. Галоўны суддзя спаборніцтваў Сяргей Шмолік вынес рашэнне аб пераносе сустрэчы на 23 траўня.



**Кубак пераможцаў стаіць у кабінеце дэкана геафака, сярод іншых адзнак майстэрства будучых географаў**

І вось у прызначаны час на поле выйшлі каманды геаграфічнага і юрыдычнага факультэтаў. Паўтаралася сітуацыя мінулага года, калі ў фінал спаборніцтваў прабіліся тыя ж каманды. Тым цікавейшай была гульня: усе жылі чаканнем рэваншу.

Ад самага пачатку гульні юрысты завалодалі ініцыятывай: пастаянна трымалі ў напружанні абарону і галкіпера географаў, аднак да рэальных пагроз справа не даходзіла.

Паціху географы пачалі вырoўніваць гульню, пераводзячы мяч да варот суперніка. Асноўная барацьба ішла ў сярэдзіне поля – каманды змагаліся з апошніх сілаў. Дрэннае поле не давала магчымасцяў прадэманстраваць сваіх лепшых здольнасцяў ні адной, ні другой камандзе. Час ішоў да перапынку, калі пры розыгрышы вуглавога Зміцер Адамчук трапным ударам з лініі штрафной пляцоўкі перапраівіў мяч у правы ніжні ад галкіпера юрыстаў вугал варот.

Не паспеў пачацца другі тайм, як географы забілі другі гол. Ішоў час, а юрысты ўсё ніяк не маглі адзначыцца, хаця моманты каля варот іх супернікаў узнікалі адзін за адным. І вось, пасля трэцяга запар розыгрыша вуглавога, мяч усё ж такі перасякае лінію варот каманды геафака. Аднак гэта ўсё, на што былі здольныя ў гэты дзень юрысты. Фінальны свісток суддзі Юрыя Рымчонка абвясціў аб другой запар перамозе геаграфічнага факультэта ў Кубку БрДУ па футболе.

І напаследак карэспандэнт "ДЗЕДЗІЧА" узяў невялічкае інтэрв'ю ў аднаго з удзельнікаў фінальнай сустрэчы, футбаліста каманды-пераможцы Леаніда Віленты.

**– Вашыя ўражанні ад перамогі?**

– У мінулым годзе не давялося паўдзельнічаць у фінальнай сустрэчы. Таму было неяк нядобра на душы, пастаянна задаваў сабе пытанне: "Ці здолею яшчэ калі-небудзь дайсці да фінала, пагуляць у ім, а тым больш перамагчы?" Я здолеў, таму гэтая перамога для мяне асаблівая.

**– За кошт чаго, на тваю думку, перамагла ваша каманда?**

– Каманда перамагла за кошт збалансаванасці ва ўсіх лініях, бо склад каманды не мяняецца ўжо два гады. Таксама ўпэўненасці надавала мінулагодняя перамога.

**– Як ты ацэньваеш ваш выступ на турніры?**

– Канешне, была вялікая адказнасць, але, улічваючы тое, што ў кожнай гульні мы прапускалі толькі па адным голе, я лічу, што абарончая лінія адыграла здорава. Дзесьці нам пашанцавала, але, як той казаў, шанцуе мацнейшым.

**– Дзякуй за інтэрв'ю, поспехаў вам у наступным годзе.**

– Вам вялікі дзякуй. Будзем намагацца спраўдзіць вашыя пажаданні.

**Віталь КОЎШ**

# Х МОЛАДЗЕВАЯ АРХЕАЛАГІЧНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ

**ДА ЎВАГІ СТАРШАКЛАСНІКАЎ, СТУДЭНТАЎ, МОЛАДЗІ, АМАТАРАЎ КРАЯЗНАЎСТВА!**

Улетку 2005 г. праводзіцца чарговая моладзевая археалагічная экспедыцыя. Час экспедыцыі: 20 чэрвеня – 4 ліпеня. Месца археалагічных раскопак: каля вёскі Адрубы (Кабанаўскі сельсавет Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці).

**Арганізатары экспедыцыі:** моладзевая суполка Светлагорскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (г. Менск).

Да ўдзелу ў экспедыцыі запрашаюцца дзяўчыны і юнакі, якія цікавяцца гісторыяй, краязнаўствам, турысцкімі вандроўкамі – навучэнцы 8-10 класаў, студэнты, а таксама моладзь з ліку ўдзельнікаў грамадскіх аб'яднанняў. Удзел у экспедыцыі – дабраахвотны і неаплатны. Удзельнікі працуюць па 4 гадзіны ў дзень на раскопках старажытнага гарадзішча, астатні час прысвячаецца адпачынку. У экспедыцыі можна браць удзел увесь перыяд яе дзеяння альбо частку дзён.

У экспедыцыі могуць браць удзел і групы, якія арганізаваныя ў навучальных установах, – навучэнцы (студэнты) пад кіраўніцтвам настаўніка (выкладчыка).

У раскопках могуць браць удзел таксама старэйшыя ўдзельнікі – аматары гісторыі, краязнаўства, турызму – з ліку ўдзельнікаў грамадскіх аб'яднанняў.

Раскопкі каля в. Адрубы праводзяцца ў маляўнічым месцы на беразе р. Бярэзіна, на тэрыторыі, дзе ствараецца ландшафтны заказнік нацыянальнага значэння. Вынікі раскопак з'яўляюцца каштоўным матэрыялам для гістарычнай навукі. Удзельнікі экспедыцыі жывуць у намётах, прыгатаванне харчавання – на вогнішчы. Кожны з маладых удзельнікаў экспедыцыі мусіць праявіць самастойнасць, не баяцца складанасцей, мець моцны характар і заўсёды быць гатовым прыйсці на дапамогу сябрам. Найбольш актыўныя ўдзельнікі экспедыцыі заахвочваюцца падзякамі і ўзнагароджваюцца пахвальнымі граматамі Інстытута гісторыі.

Непаўнагадовыя навучэнцы для ўдзелу ў экспедыцыі прадастаўляюць: 1) анкету-заяву, якая ўзгодненая з бацькамі; 2) медыцынскую даведку – па форме, якая выдаецца для дзіцячых і юнацкіх летнікаў. Паўнагадовыя асобы для ўдзелу ў экспедыцыі прадастаўляюць анкету-заяву. Гэтыя дакументы прадастаўляюцца напярэдадні альбо па прыбыцці ў экспедыцыю.

Удзел у экспедыцыі – гэта незабыўныя ўражанні і добры летні адпачынак.

Каб атрымаць дадатковую інфармацыю ці паведаміць аб жаданні узяць удзел у экспедыцыі, можна:

даслаць ліст па адрасу: аддзяленне сувязі № 2, абанентная скрыня 32, г. Светлагорск, Гомельская вобласць, 247402;

альбо звязацца па тэлефоне/факсе (02342) 4 33 49 (Вадзім Богдан), тэл. (029) 533 09 56 (Міхась Наскоў), тэл./факсе 4 76 13 (Тэльман Маслюкоў),

альбо звярнуцца на электронны адрас: mc-part@tut.by ці asvieta@tut.by.

**Dzedzich week-news**

# СТУДЕНТОВ НЕ ОТПУСКАЮТ НА ЗАРАБОТКИ ЗА РУБЕЖ

**ИМ НЕ ДАЮТ ДОСРОЧНО СДАВАТЬ СЕССИЮ, ХОТЯ УЧАСТНИКИ СТУДОТРЯДОВ ОТ БРСМ МОГУТ СДАВАТЬ ЭКЗАМЕНЫ И ЗАРАНЕЕ.**

Белорусские студенты ездят работать за границу уже лет десять. Самые активные успели съездить на заработки не один раз. Наташа, бывшая студентка иняза, была в США дважды: «Это практика языка, заработок, а главное – бесценный жизненный опыт… И по деньгам получилось удачно, и вещей я себе таких накупила, что тут два года в магазин не заходила! Из денег, которые привезла, я круглую сумму отложила, у меня на них большие планы».

Уехать раньше было легко: «В прошлом году нужны были только копии договоров с фирмой-посредником и заявление о том, что еду работать за границу, – рассказывает Сергей, студент БГУ. – А потом сдавай сессию досрочно и поезжай. Ну и приехать вовремя: говорили, что отчислят, если не вернешься до 15 сентября. Я приехал 14-го. А сейчас мне сессию не разрешают заранее сдать!»

Досрочно сдавать экзамены не запрещено, но в марте вышел знаменитый декрет президента №3, направленный против торговли людьми. И вузы закрутили гайки – для подстраховки. «У нас в начале июля только последние экзамены! – рассказали студенты БГУ. – В результате многим придется позже уезжать. А ведь затраты на программу отбиваются только месяца за полтора работы… Так что многие студенты планируют либо брать академку на год, либо ехать «с концами». А что делать? Если брать академический, то грозят восстановить только на платное, да и то под вопросом. Проще не вернуться!» Даже студентов, которые просят досрочную сессию для поездки в санаторий, обязывают сдать все долги до начала учебного года, летом.

Шансы хорошо заработать, уехав в начале июля, не высоки. Это признают даже фирмы, которые отправляют молодежь на работу: «Работодатели вообще предпочитают, чтобы молодой человек приезжал в мае и уезжал в сентябре. В июле пик сезона, трудно найти работу, снять недорогое жилье. И не факт, что работодатель, с которым вы списались и договорились, будет вас ждать. Проще будет тем, кто едет уже второй-третий раз, у них и опыт есть, и связи с работодателями».

О досрочной сдаче сессии в фирмах вежливо говорят: «Мы даем студентам возможность самим решать эту проблему». Рамки программ позволяют студентам выехать позже, и фирмы готовы везти их в любое время: «Да, вы проведете меньше времени в США, но это лучше, чем не поехать. В любом случае посмотрите мир, а если повезет с местом работы, то можете и деньги привезти!»

Если ситуация критическая и студент уехать не может, то рассматривается, за какое время до отъезда он отказался, по каким причинам? В любом случае траты немалые, вплоть до потери первого взноса (до 300 долларов для США), плюс стоимость визы, штраф от аэропорта… Деньги могут вернуть полностью, только если причина отказа очень серьезная. Является ли таковой сессия, нам не сказали – признались, что до сих с такими отказами не сталкивались.

Зато у нас вовсю формируются студенческие отряды, которые будут работать в Беларуси и России. Например, на главной студенческой стройке страны, Августовском канале, будут трудиться и студенты. В основном члены БРСМ: «Работа проходит в июне-июле-августе, бывало, что и с конца мая, – рассказал Евгений Карпик, командир республиканских студенческих отрядов БРСМ. – Ректоры давали разрешение на досрочную сдачу сессии. Вообще, каждый год Минобразования готовит письмо, чтобы студентам, которые едут работать в студенческих отрядах, разрешали досрочную сдачу сессии. В этом году такого письма пока не было, но думаю, что будет. Мы активно включились в программу «Домики на селе», в каждом районе будем искать работу для студотряда, на Августовском канале». Некоторых не только отпустят пораньше, но и засчитают работу как летнюю практику. Например, студентам историкам, археологам, связанным со строительством.



**Поможем родине! Все в стройотряды!!!**

## ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

**Наталья БАРАНОВА,** ректор Минского государственного лингвистического университета:

– Наши студенты выезжают за границу каждый год. И наше отношение к этому не меняется: пять лет назад в университете закрыли возможность досрочной сдачи экзаменов. Сессия систематизирует изученное, и если этот процесс скомкать, упадет успеваемость, это будет заметно в следующем семестре. Те, кто успевал во время семестра, могут передвинуть экзамены во время сессии. То есть не сдать досрочно, а передвинуть экзамены и уехать! Эта система работает, и все организации знают, что нашим студентам нужно предлагать варианты, по которым они должны уехать с 10-15 июня, когда закончится сессия.

**Виктор САМОХВАЛ,** проректор по учебной работе БГУ:

– Дело не в том, что вы едете на работу за границу. Студент имеет право заниматься по индивидуальному плану, только если он отличник, занимается научной работой. Это раньше, когда стройотряды формировали, все их участники сдавали сессию досрочно и уезжали. Теперь все рассматривается в индивидуальном порядке. Конечно, бывают разные ситуации, например, действительно очень тяжелое материальное положение в семье. Студенты БГУ могут один раз за время учебы брать академический отпуск на год по семейным обстоятельствам.

**Геннадий БРОВКО,** проректор по учебной работе, международной и внешнеэкономической деятельности БНТУ:

– У студента главная работа – это учеба. Чтобы получить право на досрочную сессию, нужно представить достаточные основания для декана факультета. Ведь студенту нужно обязательно пройти практику, без нее на следующий курс не переведут. А она проходит как раз в июле, августе или сентябре. Если фирме выгодно отправить студентов 1 мая, то почему университет должен подстраиваться под фирму, а не наоборот? На каникулах студенты могут ездить куда угодно, это их личное дело. У нас, я стучу по столу, все студенты возвращаются.

## ТОЛЬКО ЦИФРЫ

В прошлом году работать за границу уехали 5041 человек, около 80% из них – студенты.

## СКОЛЬКО МОЖНО ПОТРАТИТЬ И ЗАРАБОТАТЬ?

Программы, по которым фирмы отправляют студентов на работу, стоят по-разному в зависимости от страны и работы. Для США – от 500 долларов (летние лагеря, работа с детьми) до 1600-2000 долларов (работа в сфере обслуживания).

Чтобы поехать в Великобританию, нужно заплатить от 800 долларов. Студент будет работать в гостиницах, ресторанах или собирать овощи-фрукты.

В США за месяц вы заработаете минимум 1000 долларов. Соответственно, чтобы «отбить» деньги за программу, придется работать минимум полтора месяца. Побольше получают официанты, горничные за счет чаевых – чем лучше ресторан или гостиница, тем больше. За работу сверхурочно по законам США платят по более высокому тарифу.

Для участия в студотрядах БРСМ денег платить не надо. За работу в стройотряде можно заработать примерно 300 тысяч рублей в месяц.

**«КП в Беларуси»**

## ДАРЭЧЫ

Сядзіць дзядок-вартаўнік у яблыневым садзе са стрэльбай, ахоўвае. Раптам бачыць - дзеці побач праходзяць. Крычыць:

- Дзеткі! Ідзіце яблычкі есці!
- Дзед! Дык ты ж нас таго... стрэльбай!
- Ну дык а як жа.

***

Ляжыць Шэварднадзэ на падлозе, галаву і плечы засунуў пад канапу. Над ім стаяць байцы спецназу і лёгкімі штуршкамі прапаноўваюць вылезці. Той згаджаецца толькі пасля запэўніванняў, што ён не Амін і яго не прыстрэляць...

- Дазвольце, - абураецца Эдуард Амбросіевіч, - а што вы тут тады робіце і якое ў вас на гэта правы? Перабілі ахову, захапілі горад, увялі войскі! Што гэта такое?

- Дык, - адказвае камандзір, - вы месяц назад казалі, што валодаеце дакладнымі дадзенымі пра наяўнасць у Ірака зброі масавага паражэння і пагадзіліся даць тэрыторыю і паветраную прастору для ўдара сіл кааліцыі па яму?

- Казаў...

- А казалі, што не баіцеся ўдара ў адказ іракскіх войскаў па Грузіі?

- Ну казаў...

- Дык вось - яны ўдарылі.

- Якія нафіг... іракцы - вы ж расейцы, з тыповымі разанскімі тварамі!

- А ў нас даверанасць.

***

Муж і жонка, якія ўжо адзначылі срэбранае вяселле, сядзяць раніцай за сталом, снедаюць. Жонка глядзіць на мужа доўгім поглядам і пытае:

- Толік, калі ласка, скажы мне - ты мяне ўсё яшчэ кахаеш?

Мужык раздражнёна шпурляе відэлец на стол:

- Люся, ну вось патлумач мне - ну навошта пачынаць кожны ранак са скандала?!

***

Сям'я замяняе ўсё. Таму перш чым яе завесці, падумай, што для цябе больш важнае: усё ці сям'я.

***

Можна вывесці дзяўчыну з вёскі, але вёску з дзяўчыны вывесці практычна немагчыма.

***

Мужык скардзіцца сябрам:

- Мяне гэтыя сакавіцкія каты задалбалі! "Мяў ды мяў"... Я на іх ужо сабаку выпускаў...
- І што каты?
- Ды што каты... Шчаняты нікому не патрэбны?

***

Мужык пайшоў у тайгу на паляванне. Заблукаў. Ноч. Холад. Жахліва. Стаіць, енчыць:

- Ау! Дапамажыце! ¨сць тут хто-небудзь?

Раптам адчувае, нехта ззаду да пляча дакранаецца. Абарочваецца - там вялізны мядзьведзь, пытае:

- Ну я ёсць! Лягчэй стала?

***

Дзярждума ўхваліла законапраект аб новым парадку выбараў губернатараў. Наступны этап развіцця дэмакратыі ў Расеі - для кандыдатаў у прэзідэнты трэба будзе згода прэзідэнта.

У Маскве прайшла акцыя - "Очисти город от мусора". У выніку акцыі забіты 23 супрацоўнікі міліцыі...

***

Гаспадар схаваў ад жонкі пляшку гарэлкі ў гадзіннік з зязюляй.

Прайшоў некаторы час, адчыняецца гадзіннік і адтуль выпаўзае зязюля:

- Мужык, колькі часу?
- Дзевяць гадзін.
- Тады ку-ку!

***

Муж прыносіць дахаты папугая і гаворыць:

- На аўкцыёне я аддаў за яго дзвесце франкаў. Яго хацелі набыць дзесяць чалавек... Але самае цікавае – я нават не ведаю, ці размаўляе ён?

- Як гэта, ці размаўляю я? - балбоча папугай. - А хто ж тады падвышаў кошт?

***

На міліцэйскім участку звоніць тэлефон:

- Ратуйце, - чутно ў слухаўцы. - Дапамажыце!
- Зараз выязджаем, - кажа інспектар. - Але што здарылася?
- У пакой уварвалася кошка!
- Прабачце, але па такіх дробязях міліцыю не турбуюць. Хто вы?
- Як гэта хто? Папугай, канешне!

***

Студэнт у сталоўцы падсаджваецца за стол да выкладчыка. Той яму кажа:

- Гусь свінні не таварыш!

Студэнт:

- Ну, я паляцеў, - і сыходзіць. Выкладчык вырашыў заваліць яго на іспыце, але студэнт адказаў на "выдатна". Выкладчык задае пытанне:

- Вы ідзеце па дарозе і бачыце 2 торбы: адна з розумам, другая з золатам. Якую вы возьмеце?
- З золатам!
- А я бы ўзяў з розумам.
- Каму чаго не хапае.

Выкладчык піша ў залікоўцы "казёл" і той, незаўважыўшы, сыходзіць. На наступны дзень студэнт вяртаецца і гаворыць:

- Прафесар, вы мне ў залікоўцы распісаліся, а адзнаку паставіць забыліся.

***

Згодна пасляматчаваму пратаколу данецкі "Шахцёр" разграміў "Барселону" з лікам 12:1. Еўрапейскія назіральнікі не прызнаюць вынікі матча, таму што суддзя дазволіў данецкай камандзе падвысіць яўку футбалістаў на поле да трыццаці чалавек, якія гралі пяццю адкрапляльнымі мячамі!

***

Па БТ ідзе дзіцячая перадача:

- Дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі! Калі вы пачуеце, што вашы бацькі альбо іншыя сваякі і знаёмыя лаюць наш любімы ўрад і нашага ўсенароднаабранага прэзідэнта, напішыце нам пра гэта на адрас: г. Менск, пр-кт Дзяржынскага, 19/17, перадача "КДБгэдэйка". З нецярпеннем будзем чакаць вашыя лісты, дарагія дзеці!

***

Дзіўнае жыццё: кахаеш адну жанчыну, жывеш з другой, спіш з трэцяй, дзеці ад чацвёртай, любіць цябе пятая, і гэта пятая - твая маці...

Адкрыты сакрэт шчаслівага сямейнага жыцця! Аказваецца, для гэтага жонка павінна быць "жаўруком", а муж - "савой".

Тады жонка не бачыць, якім муж прыходзіць дадому, а муж не бачыць, якой яна прачынаецца раніцай!

***

Мужык прачынаецца ранкам з жудаснага бадуна, расплюшчвае вочы, галава баліць, азіраецца навокал: фуууу, дома... устае з ложка, абмацвае сябе - ё-маё, у піжаме... у жыцці піжаму не апранаў...

Бачыць - на туалетным століку шклянка вады, таблетка аспірыну і цыдулка ад жонкі: "Каханы, сняданак на стале, усё прыбрала, твая навекі - жонка". Мужык у поўным неразуменні, выпівае таблетку і ідзе ў ванны пакой... па дарозе выяўляецца, што кватэра не тое што чыстая - проста вылізана да бляску; сын сядзіць у сябе ў пакоі, робіць урокі...

- Сынок, а што ўчора было?

- Ты прыйшоў п'яны, як звычайна пад ранак... Аббляваў усю гасцёўню, нагадзіў міма унітаза, пабіў на кухні ўвесь посуд, паставіў маці фінгал пад вокам...

- Ну і што здарылася з маці, з кватэрай?

- Ааа, ты пра гэта! Проста калі цябе мама ўкладвала спаць і пачала сцягваць з цябе нагавіцы - ты закрычаў: "пайшла на хрэн, сцерва - я жанаты!!!".

***

Прыходзіць сакратарка да шэфа і пытае:

- Я што, звольнена?
- Не, канешне!
- А чаму канапу з кабінета прыбралі?

***

Тэлеперадача "Добрай ночы, малышы".

Сцяпашка: Філя, а дзе Хруша?

Філя: ¨н не прыедзе, у яго свінка.

Сцяпашка: Ой, Хрушачка, мабыць, ляжыць зараз у ложку?

Філя: Ты што, звар'яцеў, яны толькі ўчора пазнаёміліся!!!

***

Праграма "Рускі кухар", якой аздоблены нашыя мікрахвалёўкі, не толькі хутка згатуе вам смачную страву, але і стыбрыць пры гэтым палову прадуктаў.

***

Перад калядамі настаўніца пытае дзяцей:

- Заўтра мы адзначаем Раство Хрыстова. А ці ведаеце вы, дзе Ісус Хрыстос цяпер?

Машанька:

- ¨н у маім сэрцы!

Мішанька:

- ¨н на нябёсах!

Вовачка:

- ¨н у нас дома ў прыбіральні!

Настаўніца:

- Што-о-о-о-о?!

Вовачка:

- Ей-Богу, кожную раніцу тата падбягае да прыбіральні, дзёргае за ручку, потым б'е кулаком у дзверы і крычыць "Госпадзі Ісусе! Ты ўсё яшчэ там?!"

№4 Дзедзіч
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
чэрвень 2005

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 07.06.2005 у $18^{00}$
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Лена, М. Ікола, Д. Змітрый, М. Арыя, С. Яргей, С. Яржук, Ю. Рась.
**Адказны сакратар:** А. Ндрусь. **Вёрстка:** Б. Дэпеша

**Кантактны тэлефон:** (0162) 23-68-02, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39
**E-mail:** dzedzich@dzedzich.org, інтэрнэт: www.dzedzich.org